КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 24 (247) ◂ 17 чэрвеня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

## УСІХ НЕ ПЕРАСАДЖАЮЦЬ

Народ даўно зразумеў: калі ўрад кажа, што ўсё будзе добра, — чакай пагаршэння. Калі Нацбанк пераконвае, што дэвальвацыі не будзе, значыць, яна будзе абавязкова

Стар. 3

## ПАЛІТЫКА І ВЕРНАСЦЬ

Як павінна рэагаваць жонка палітыка на навіну пра тое, што яе муж ходзіць налева?

Стар. 13

## МЫ ЗА ЦАНОЙ НЕ ПАСТАІМ

Стар. 15



ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ

Стар. 4

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10024

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**МАСТАК АЛЕСЬ ПУШКІН**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Лёсы»

▸ МЕРКАВАННЕ

# ХТО «ШАРАХНЕ» ПЕРШЫ?

Вольга ХВОІН

**Па краіне ўспыхваюць лакальныя акцыі пратэсту. Традыцыйна мёртвы ў плане палітычнай і сацыяльнай актыўнасці летні сезон гэтым разам прыносіць ці не штодня сюрпрызы ўладам.**




Вечарам 12 чэрвеня на памежным пераходзе «Брузгі» на беларуска-польскай мяжы беларусы выступілі з пратэстам супраць уведзеных абмежаванняў на вываз за мяжу паліва і тавараў. Справа дайшла да сутычкі з АМАП. Прыкладна 200 чалавек перакрылі ўезд аўтатранспарту на гэты пункт пропуску. Яны выставілі патрабаванне сустрэцца з прадстаўнікамі органаў дзяржкіравання. На месца канфлікту прыбылі старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра, кіраўнікі абласных УУС, УКДБ, пракуратуры і мытні.

Аднак мірным шляхам супярэчнасці не былі вырашаныя. АМАП, нягледзячы на актыўны супраціў, адціснуў натоўп, а найбольш актыўных запіхнулі ў аўтазакі. На 22 асобы былі складзеныя пратаколы паводле артыкула 23.4 (непадпарадкаванне законнаму распараджэнню ці патрабаванню службовай асобы пры выкананні ім службовых паўнамоцтваў) і артыкула 23.34 (парушэнне парадку арганізацыі ці правядзення масавага мерапрыемства ці пікетавання) КоАП. Незадаволеных пакаралі вялікімі штрафамі. Прэс-служба Дзяржаўнага памежнага камітэта распаўсюдзіла інфармацыю, што затрыманым у пункце міжнароднага пропуску «Брузгі» ўдзельнікам і арганізатарам беспарадкаў будзе абмежаваны выезд з Беларусі. Дарэчы, відавочцы гавораць, што супрацоўнікі міліцэйскага спецназа збівалі затрыманых у аўтазаку, а да таго прымянілі слязісты газ, каб разагнаць незадаволеных вадзіцеляў. Аднак міліцыянты пярэчаць, сцвярджаюць, нібыта газ распыліў нехта з удзельнікаў акцыі пратэсту.

На сходзе ў Гродзенскім аблвыканкаме старшыня аблвыканкаму Сямён Шапіра асудзіў дзеянні пратэстоўцаў на памежным пераходзе «Брузгі». Патрэбу абмежаваць вываз бензіну ён патлумачыў тым, што яго вытворчасць у краіне, па сутнасці, стратная. «Тое, што ўчора адбылося, — гэта ганебнае сярэднявечча. Пытанні ёсць, іх трэба вырашаць такім чынам: вы іх задаяце, мы павінны адказваць. Усе мы тут нармальныя людзі, дарэчы, з зямлі прыйшлі, не з неба ўпалі. Мы бачым, што вы прыносіце ў эканоміку валюту, вы даяце станоўчы эфект, — заявіў чыноўнік прадпрымальнікам падчас сустрэчы. — Я вам на пачатку размовы сказаў, што да мяне даходзіць інфармацыя, што на нейкім пераходзе таксама будуць паказваць непадпарадкаванне. Я ясна сказаў: калі будзе перакрыты рух, то я ні за каго не хаваюся, ніякіх кансультацый і перагавораў, ніякіх выклікаў губернатара — тут жа АМАП — і навесці парадак!»

Ні дня без акцый, вырашылі беларусы. І на наступны дзень арганізавалі падобны пратэст у Брэсце на памежным пераходзе «Варшаўскі мост». Старшыня Брэсцкага аблвыканкаму Канстанцін Сумар прыехаў на пераход і паабяцаў, што «будзе інфармаваць Мінск аб сітуацыі на мяжы».

З 11 чэрвеня ў Беларусі дзейнічаюць абмежаванні на вываз фізічнымі асобамі аўтамабільнага паліва. Паліва, якое вывозіцца больш за адзін раз на працягу пяці сутак за межы Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі, абкладаецца экспартнай пошлінай. З 12 чэрвеня ўстаноўлена забарона і спецыяльны збор на вываз асобных тавараў за межы Мытнага саюза. Гэтыя рашэнні ўлады тлумачаць неабходнасцю абароны спажывецкага рынку ва ўмовах крызісу. Аднак у памежных гарадах і мястэчках многія людзі зарабляюць на жыццё менавіта гандлем таварамі, таму забарона істотна ўдарыла па магчымасці папаўняць сямейныя бюджэты.

Юрый жыве ў Брэсце, ён адмыслова набыў мікрааўтобус, каб вазіць салярку ў Польшчу, там прадаваць, а назад прывозіць пральныя парашкі, тэхніку і гэтак далей. «За суткі раней можна было некалькі разоў праехаць, потым, з-за таго, што многа машын гоняць, адзін раз ездзіў — чэргі былі вялікія. Зараз чэргаў няма, пасля ўвядзення абмежаванняў невыгодна стала ездзіць, набыццё аўтобуса акупіць не атрымаецца, — расказвае транспамежны гандляр. — Учора прыехаў на «Варшаўку» паглядзець, можа што змянілася, убачыў амапаўцаў, пачакаў трохі і скіраваўся назад, каб вярнуцца праз пяць дзён, як прадугледжана новаўвядзеннямі, бо ведаў, што ў Гродна амапаўцы ўсіх разагналі. Зараз усе будуць чакаць яшчэ тыдзень, як паабяцаў Сумар...»

Улады Беларусі мусяць рэагаваць на падобныя «выбрыкі» электарату. Закранутыя за жывое, за ўласныя інтарэсы, шараговыя беларусы ўяўляюць сабой адрозную ад апазіцыі сілу. На маршы прадпрымальнікаў зімой 2008 года ў сталіцы раз'ятраныя цёткі ў норкавых футрах і моцныя дзяцюкі ў кажухах неслі куды большую пагрозу ўладзе, чым дзясятак-другі ідэйных юнакоў з «Маладога фронту». Дарэчы, тады і пакаралі за вулічную акцыю менавіта моладзь, за якой не стаіць сцяна ўсенароднага гневу.

Аляксандр Лукашэнка на пратэстныя ўспышкі адно змог адказаць пагрозай «шарахнуць». Эканамічнай стабільнасцю крыць не атрымліваецца. «Ладзяць там забастоўкі, што ім не дазволілі за бясцэнь вывозіць паліва, цыгарэты, іншыя тавары. Раней такіх называлі спекулянтамі. Яны ж і ёсць спекулянты», — сказаў ён. «Гэта — так званая рынкавая эканоміка... Нідзе гэтага няма, а ў нас гэты рынак насаджаюць», — адзначыў Лукашэнка. «Я што, на гэта глядзець буду?» — прыгразіў кіраўнік дзяржавы. Канструктыўных рэкамендацый і меркаванняў, як даць людзям зарабляць на жыццё, не прагучала.

Незадаволенасць дзейсным кіраўніцтвам дзяржавы складваецца ў агульную карціну і з эмпірычных, і з даследчых фактаў.

Працяг на стар. 5 ▸

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ПЕРАД ЭТАПАМ — ІЗАЛЯЦЫЯ

Таццяна ШЭЛЕГ

**Перад адпраўкай у шклоўскую калонію Міколу Статкевіча ізалявалі ад кантактаў з жонкай. Ёй адмовілі ў спатканні і не прапускалі да палітвязня лісты.**



Марына Адамовіч, грамадзянская жонка Міколы Статкевіча, паведаміла: «Атрымала ад Міколы ліст, дзе ён піша, што ніводнага майго не атрымаў». Акрамя таго суддзя Людміла Грачова, якая вынесла Статкевічу вырак (6 гадоў зняволення), адмовіла ў спатканні. «Я абсалютна ўпэўнена ў тым, што адмовілі мне адмыслова. Дробная такая подласць, я інакш гэта назваць не магу», — сказала Марына Адамовіч.

Мікола Статкевіч, як і палітвязень Аляксандр Класкоўскі, падаў заяву на перавод у калонію, не чакаючы разгляду касацыйнай скаргі. У ноч з 11 на 12 чэрвеня іх адправілі з мінскага СІЗА (на вул. Валадарскага) у шклоўскую калонію. Марына Адамовіч адзначыла: «Падача касацыйнай скаргі была прынцыповай пазіцыяй Міколы. Каб ніхто і ніколі не здолеў сказаць, што ён прызнае прысуд справядлівым. Разгляду яе чакаць не мае сэнсу, бо гэта чарговы фарс, у якім удзельнічаць, мабыць, бессэнсоўна для чалавека, які мае свой уласны гонар і годнасць.

Ну і да таго ж, яны паўгода не бачылі неба. Калонія ў параўнанні з СІЗА КДБ і з СІЗА на Валадарцы — гэта ўсё ж такі адносна больш свабодныя ўмовы ўтрымання. Гэта мажлівасць бачыць не малюсенькі кавалачак неба ў клетачку, а неба на вуліцы. Урэшце, зняволеным проста не хапае паветра ў камерах.

Мікола, на жаль, не вельмі расказвае пра праблемы, з якімі, як ён лічыць, ён можа справіцца. У псіхалагічным сэнсе, ён напісаў, і я абсалютна ў гэтым упэўнена, што ў яго стан нармальны. Што ён ніколі не зрабіў і не зробіць таго, за што яму будзе сорамна».

У шклоўскай калоніі, як вядома, адбывалі тэрмін зняволення палітвязні Зміцер Дашкевіч і Мікола Астрэйка. Яна знаходзіцца ў пасёлку Маладзёжны пад Шкловам.

Лісты вязням можна дасылаць на адрас:

213 004 Магілёўская вобл., г. Шклоў

папраўчая калонія № 17

КАМПАНІЯ

# БХД ДУМАЕ ПРА ПАЛІТВЯЗНЯЎ

Вольга ХВОІН

**Аргкамітэт па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» за вызваленне палітвязняў і супраць абортаў. БХД пачынае працу ў рэчышчы адпаведных заяўленым тэмам кампаній.**



Найперш ставіцца мета дамагчыся вызвалення палітвязняў краіны. Таксама Хрысціянскія дэмакраты будуць ладзіць інфармацыйную кампанію аб прычынах эканамічнага крызісу і дамагацца праявядзення свабодных выбараў. Сустаршыня аргкамітэта БХД Віталь Рымашэўскі гаворыць, што да людзей трэба ісці не толькі з тэмай эканамічнага крызісу. «Бліжэйшыя месяцы будзе кампанія, накіраваная на вызваленне палітычных вязняў і правядзенне ў Рэспубліцы Беларусь свабодных выбараў усіх узроўнях. Нягледзячы на тое, што для большасці грамадзян сёння больш навідавоку эканамічная праблема, мы мяркуем, што цяпер у Беларусі пасля падзей 19 снежня, пасля масавых рэпрэсій, пасля прысудаў былым кандыдатам у прэзідэнты, як ніколі зручны час, каб патлумачыць беларускаму грамадству сувязь эканамічных і палітычных працэсаў», — зазначае экс-кандыдат у прэзідэнты ад БХД Віталь Рымашэўскі.

У межах кампаніі за свабодныя выбары і вызваленне палітвязняў плануецца правесці пікеты, распаўсюдзіць інфармацыю пра прычыны эканамічнага крызісу, вынікі выбараў і вынікі судовых працэсаў у сувязі са справай 19 снежня 2010 года ў Мінску. Зладзяць і збор подпісаў пад патрабаваннем неадкладнага вызвалення палітычных вязняў. Апроч таго БХД будзе звяртацца да міжнародных арганізацый, каб яны праяўлялі салідарнасць. «Будзем дамагацца куратарства дэпутатаў парламентаў дэмакратычных краін свету над усімі без выключэння палітвязнямі», — гавораць кіраўнікі БХД.

БХД таксама заклікае ўсе міжнародныя структуры і ўрады дэмакратычных краін устрымацца ад правядзення перамоў, у тым ліку звязаных з палітычным і з эканамічным супрацоўніцтвам, з прадстаўнікамі ўладных структур Рэспублікі Беларусь да моманту вызвалення ўсіх палітвязняў.

Хрысціянскія дэмакраты маюць намер працягнуць кампанію па скарачэнню колькасці абортаў у Беларусі. Для гэтага БХД прапануе паменшыць тэрмін цяжарнасці, пры якім дапускаюцца аборты, увесці права лекара на адмову ад правядзення аборту, аказваць дзяржпадтрымку СМІ, што прапагандуюць мацярынства і адказнае бацькоўства. Гаворыць сустаршыня аргкамітэта партыі Аляксей Шэйн. «Мы мяркуем, што вельмі важна напрацаваць добрую заканатворчую базу, якая потым магла б быць прыдатнай для вырашэння гэтых пытанняў. Мы вымяраем стрыжнявое пытанне — дэмаграфічнае — і пакуль няма ніякага адказу. У нас месячная дапамога на дзіця дазваляе купіць толькі два пакункі памперсаў. А лозунг, якія кідаў Лукашэнка, маўляў, давядзём насельніцтва Беларусі да трыццаці мільёнаў жыхароў... З такой палітыкай сітуацыя будзе толькі пагаршацца», — гаворыць сустаршыня партыі Аляксей Шэйн.

Аляксей Шэйн заявіў, што цяпер узмацніўся ціск на рэлігійныя суполкі за дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый, таму БХД будзе ініцыяваць адмену ч. 1 артыкула 193 Крымінальнага кодэкса, паводле якога і караюць незарэгістраваных вернікаў і маладафронтаўцаў.

ПАДТРЫМКА

# ІНФАРМАЦЫІ БУДЗЕ БОЛЬШ

**Ва ўкраінскай інтэрнэт-прасторы з'явіўся новы інфармацыйны сайт, які спецыялізуецца на падзеях з Беларусі. Гэта сайт грамадскай арганізацыі Цэнтр рэгіянальнага развіцця «Супрацоўніцтва без межаў»: www.collaboration.org.ua.**

Адзначым, што Цэнтр рэгіянальнага развіцця «Супрацоўніцтва без межаў» быў створаны для аб'яднання як мага большай колькасці ўкраінцаў, якія хацелі б паспрыяць дэмакратычным зменам у Беларусі.

Акрамя таго, Цэнтр рэгіянальнага развіцця займаецца наладжваннем стасункаў з моладзевымі арганізацыямі іншых краінаў, супрацоўніцтвам з арганізацыямі ўкраінскай дыяспары, упарадкаваннем месцаў пахаванняў украінцаў у замежжы.

Партнёрамі цэнтра ўжо з'яўляюцца такія беларускія арганізацыі, як рух «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча, «Малады Фронт», Моладзь «Беларускага Народнага Фронту», «Маладая Беларусь», «Правы Альянс» і шэраг іншых.

Цэнтр выступіў ініцыятарам кампаніі «Украінская музыка для Беларусі», якая зараз распачалася ва Украіне. Украінскія музыкі заспяваюць песні на беларускай мове на пратэставую тэматыку.

Першым для беларусаў заспяваў гурт «Фіолет» з горада Луцка. Па словах лідара «Фіолету» Сяргея Мартынюка, ідэя заспяваць песню на беларускай мове ў гурта з'явілася ўжо даўно. «Гэта беларускамоўная песня «Мейсца пакуты» аўтарства Яна Маўзера, вакаліста вядомага беларускага альтэрнатыўнага гурта «MAUZER», які падарыў яе нам. Ідэя заспяваць беларускамоўную песню на пратэставую тэматыку з'явілася ў нас пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі напрыканцы мінулага года. І пасля жорсткага разгону мірнай акцыі пратэсту ў Мінску. Гэтым самым мы паказваем сваю салідарнасць з беларускім народам. Тое, што нашу ініцыятыву выразіла падтрымаць грамадская арганізацыя Цэнтр «Супрацоўніцтва без межаў», дадало нам дадатковага імпэту для нашай творчай працы над гэтай песняй», — падкрэсліў Мартынюк.

Музыка заўсёды адыгрывала важную ролю пры палітычных зменах у розных краінах свету. Так было і пры памаранчавай рэвалюцыі ва Украіне. Таму Цэнтр «Супрацоўніцтва без межаў» спадзяецца, што і кампанія «Украінская музыка для Беларусі» зможа натхніць беларусаў для новай барацьбы і доўгачаканых пераменаў.

**P.S.** Пачуць песню можна тут: http://prostopleer.com/tracks/4909327s0rN

**Паводле прэс-службы «Супрацоўніцтва без межаў»**

МВФ

# РУБЕЛЬ ТРЭБА АДПУСЦІЦЬ

Вольга ХВОІН

**Міжнародны валютны фонд прапануе ўраду і Нацыянальнаму банку Беларусі адмовіцца ад падвышэння зарплаты і адправіць курс рубля ў свабоднае плаванне.**




«У Беларусі сур'ёзны эканамічны крызіс, але ёсць выхад. Мы рэкамендавалі дзяржаўным органам — прэзідэнту, ураду, Нацыянальнаму банку — працаваць разам, каб распрацаваць дакладны план па выхаду з крызісу. Яны мусяць патлумачыць насельніцтву, што і якім чынам мусяць гэта зрабіць, — заявіў кіраўнік місіі МВФ па Беларусі Крыс Джарвіс. — Вытокі крызісу ляжаць у лішкавым аб'ёме крэдытавання і росце аплаты працы, калі гэтага не трэба было рабіць».

Міжнародны валютны фонд раіць правесці поўную лібералізацыю на ўсіх сегментах валютнага рынку і ўніфікацыю абменнага курсу беларускага рубля. «Валютны рынак зараз не працуе. Мала хто гатовы прадаваць замежную валюту па афіцыйным курсе. А большасць ахвотных набыць валюту вымушаныя набываць яе па менш выгадным абменным курсе», — сказаў кіраўнік місіі.

МВФ раіць перайсці на рэжым плаваючага абменнага курсу. «Такім чынам абменны курс будзе ўстанаўлівацца пад уздзеяннем рынкавых сіл, адпаведна, будзе адбывацца свабоднае фарміраванне курсу на міжбанкаўскім рынку і рынку наяўнай валюты», — зазначыў Джарвіс. Гэта дазволіць збіць тэмпы інфляцыі, скараціць дэфіцыт аперацый і стабілізаваць эканоміку. Кіраўнік місіі зазначыў, што мінусамі гэтых крокаў будзе нізкая заработная плата і нявызначанасць валютнага курсу пэўны перыяд часу, аднак гэта «факты жыцця». Ён падкрэсліў, што эксперты МВФ не робяць прагнозаў адносна значэнняў абменнага курсу. Кіраўнік місіі МВФ пазітыўна ацаніў той факт, што Нацбанк Беларусі ў сакавіку спыніў свае валютныя інтэрвенцыі на рынку. «Было б памылкай аднавіць інтэрвенцыі ў значных аб'ёмах у падтрымку якога-небудзь значэння курсу, — сказаў Джарвіс. — Плаваючы курс лепшы за фіксаваны. Пры гэтым мы не выключаем невялікіх інтэрвенцый з боку Нацбанку, каб згладжваць вялікія ваганні курсу».

Эфектыўнасць плаваючага курсу будзе мець месца, калі Нацбанк зробіць больш жорсткай грашова-крэдытную палітыку, падвысіць працэнтныя стаўкі, а таксама будуць скарочаныя расходы дзяржбюджэту.

Крыс Джарвіс сказаў, што эксперты місіі МВФ пазітыўна ацэньваюць меры, ужо прынятыя ўрадам і Нацбанкам Беларусі. У прыватнасці, кіраўніцтва «паспяхова» спраўляецца са скарачэннем дэфіцыту бюджэту і крэдытавання па дзяржпраграмах.

МВФ папярэджваў пра негатыўныя тэндэнцыі, якія развіваюцца ў эканоміцы Беларусі. Аднак крызіс аказаўся «больш моцным і развіваўся хутчэй», чым меркавалі эксперты МВФ.

Пачаліся перамовы аб магчымасці падрыхтоўкі новай праграмы супрацоўніцтва. Аднак гаварыць пра аб'ёмы фінансавай дапамогі пакуль рана. «Мы пачалі перамовы аб магчымай новай праграме з МВФ. Перамовы толькі пачаліся, і нам трэба прайсці яшчэ доўгі шлях», — сказаў кіраўнік місіі Міжнароднага валютнага фонду ў Беларусі.

Нагадаем, 31 мая ўрад і Нацбанк Беларусі накіравалі ў МФВ запыт на прадстаўленне краіне стабілізацыйнага крэдыту. Паводле слоў прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча, Мінск запытвае 3,5–8 мільярдаў долараў на тэрмін 3–5 гадоў.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД




# УСІХ НЕ ПЕРАСАДЖАЮЦЬ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Аляксандр Лукашэнка зноў пагражае тым, хто бударажыць «крыштальны сасуд, які ён нясе ў сваіх руках». Відавочна, яго не тое што занепакоіла — можна сказаць, раз'юшыла хваля стыхійных пратэстаў супраць збяднення насельніцтва і «эканамічнага цуду». Ён нават узяўся за сацыяльныя сеткі.**

14 чэрвеня падчас наведвання сельгаспрадпрыемства «Азярыцкі-Агра» Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці Лукашэнка проста абрынуўся на інтэрнэт. «У нас «свядомыя» ў Мінску ў сацыяльных сетках, інтэрнэце заклікаюць да забастовак. Я так буду глядзець, назіраць, а потым як шарахну — не паспеюць за мяжу перабегчы», — заявіў Лукашэнка.

Між іншым, сацыяльныя сеткі тут не пры чым. Усе страйкі ўзнікалі стыхійна, з мінімальнай каардынацыяй. Як паказвае практыка, сацыяльнымі сеткамі карыстаюцца тыя, каму «і так усё зразумела». Але толькі маленькая частка з іх гатовая на актыўныя дзеянні. Прыкладам, за скасаванне сумнавядомага Указу №60, які рэгулюе інтэрнэт, выказаліся сотні людзей — у інтэрнэце. А на дазволены (!) мітынг з гэтай нагоды прыйшло менш за сотню чалавек.

І ўжо, канешне, не вельмі карыстаюцца інтэрнэтам працаўнікі Трактарнага заводу альбо «Рэчыцапіва», дзе не так даўно ўзніклі стыхійныя страйкі.

Пэўна, больш за ўсё Лукашэнку пужае стыхійная салідарнасць людзей. Пасля таго, як аўтамабілісты заблакавалі рух транспарту на галоўным праспекце Мінска, шмат каму з іх былі выпісаныя штрафы. Агульная сума штрафаў склала больш за 3,3 мільёна рублёў. У рэкордныя тэрміны актывісты інфармацыйна-асветнай установы «За Аўто» з дапамогай грамадзянаў сабралі больш за гэту суму. І вечарам 10 чэрвеня ў адным з мінскіх аддзяленняў «Беларусбанка» заплацілі за аштрафаваных удзельнікаў акцыі пратэсту «Стоп-бензін» васьмю кілаграмамі грошай.

100 тысяч з гэтай сумы актывісты перадалі купюрамі наміналам 10, 20 і 50 рублёў — гэта выкладзеная ў пакет дробязь і заважыла каля васьмі кілаграмаў.

Людзі, якія знаходзіліся каля касы, пачалі здымаць працэс прыёму і пераліку грошай на камеры мабільных тэлефонаў і фотаапараты, што не спадабалася супрацоўніцам банкаўскага аддзялення. Пасля беспаспяховых спробаў забараніць здымкі і разысціся адна з супрацоўніц скарысталася «трывожнай кнопкай» і выклікала міліцыю.

Міліцыянеры, якія прыбылі ў банк праз некалькі хвілін, так і не зразумелі, чаму іх выклікалі. Яны заявілі, што ніякіх парушэнняў не бачаць, і праз некалькі хвілін пакінулі будынак. Пералік грошай доўжыўся 45 хвілін.

Больш за тое, пасляканчатковага падліку сума сабраных грамадзянамі сродкаў перавысіла 5,2 мільёна рублёў, — «ліміт» штрафаў перавышаны. Таму прынамсі 1 мільён рублёў з рэшты сродкаў, сабраных грамадскасцю для аштрафаваных, актывісты «За Аўто» перададуць у дзіцячы дом, паведаміў дырэктар установы Арцём Шаркоў. Астатнія грошы таксама могуць быць пераведзеныя на рахунак дзіцячага дома або будуць унесеныя ў «фонд» падтрымкі будучых «штрафнікоў».

Думаю, што такая ж сітуацыя будзе і з тымі, хто блакаваў памежны пераход «Брузгі».

Аляксандру Лукашэнку лепш было б паглядзецца ў люстэрка. Бо народ ужо даўно зразумеў: калі ўрад кажа, што ўсё будзе добра, — чакай пагаршэння. Калі Нацбанк пераконвае, што дэвальвацыі не будзе, значыць, яна будзе абавязкова. Калі прэзідэнт абяцае ўрэгуляваць валютную сітуацыю за два месяцы — валюты ў абменніках не чакай. Гэта відавочны крызіс улады. І крызіс сістэмны.

51% беларусаў лічаць, што праблемы з валютай у краіне — гэта вынік дрэннай эканамічнай палітыкі беларускіх уладаў. А 27% упэўненыя ў тым, што следства дзейнасці сілаў, зацікаўленых у падрыве стабільнасці ў краіне. Такія вынікі майскага апытання НІСЭПД (Вільнюс).

Між тым, ужо 67% лічаць, што ў Беларусі патрэбныя эканамічныя рэформы. А вось пра гатоўнасць узяць удзел у масавых акцыях пратэсту і страйках кажуць толькі 8% рэспандэнтаў.

Паказальна, што амаль 55% беларусаў не вераць у афіцыйную асноўную версію тэракту 11 красавіка ў мінскім метро, што яго здзейсніў тэрарыст-адзіночка з нездаровай псіхікай.

За эканамічныя рэформы 67% — гэта ўжо паказальнік. Але ж эканамічныя рэформы заўсёды цягнуць за сабой рэформы палітычныя. Не можа быць эканамічных рэформ без палітычных, бо ў краіну з іміджам «дыктатура», у краіну, супраць якой уводзяцца санкцыі, ніякі добрасумленны інвестар не сунецца. Інакш ёсць пагроза самому падпасці пад санкцыі. Каму гэта трэба?

Дарэчы, пра санкцыі. Прэзідэнт ЗША Барак Абама падоўжыў яшчэ на год санкцыі ў дачыненні да беларускіх чыноўнікаў, уведзеныя 16 чэрвеня 2006 года яго папярэднікам Джорджам Бушам.

Паводле звестак прэс-службы Белага дома, санкцыі былі прыняты «ў сувязі з надзвычайнай пагрозай нацыянальнай бяспецы і знешняй палітыцы Злучаных Штатаў». Пагроза заключаецца ў дзеяннях «асобных членаў беларускага ўрада і іншых асоб, якія разбураюць дэмакратычныя працэсы або інстытуты, парушаюць правы чалавека». Гэта праяўляецца ў «палітычных рэпрэсіях, уключаючы затрыманні і знікненні; ва ўдзеле ў грамадскай карупцыі, у тым ліку адцягванне або неналежнае выкарыстанне дзяржаўных актываў ці злоўжыванне дзяржаўнай уладай».

Абама заявіў пра заганы прэзідэнцкай выбарчай кампаніі ў Беларусі ў снежні 2010 года, насілле ў дачыненні да мірных дэманстрантаў, якія выйшлі абараняць свой выбар, пераследаванні і зняволенне ў турму апазіцыйных кандыдатаў, працяг рэпрэсій у адносінах да незалежных СМІ і актывістаў грамадзянскай супольнасці. «Усё гэта сведчыць пра тое, што беларускае кіраўніцтва робіць крокі назад у развіцці дэмакратычнага кіравання і павазе правоў чалавека», — сказаў ён.

Гэта наўпроставы «званочак» не толькі беларускаму кіраўніцтву, але і ўсяму сусвету: не звязвайцеся з Беларуссю! Нафты ў ёй, канешне, няма, але і каштоўнасці чагосьці вартыя.

І апошнюю кропку паставіў Міжнародны валютны фонд. Як заявіў кіраўнік місіі МВФ па Беларусі Крыс Джарвіс 13 чэрвеня на брыфінгу ў Мінску, МВФ пакуль не абмяркоўвае аб'ёмы фінансавай дапамогі Беларусі ў межах магчымай новай праграмы супрацоўніцтва. То бок, крэдыту ў доларах ад МВФ найбліжэйшым часам чакаць не даводзіцца.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АНАТОЛЬ ЛЕМЯШОНАК



Кіраўнік праўладнага Саюза журналістаў, рэдактар газеты «Рэспубліка» Анатоль Лемяшонак паскардзіўся, што дзяржаўныя выданні адчуваюць фінансавыя цяжкасці. «Паліграфія стала значна даражэй. Пакуль Шклоўскі завод не спяшаецца нам нейкія палёгкі рабіць, а наадварот, ёсць спробы ўзяць апошняе з нас», — цытуе рэдактара «Рэспублікі» Радыё «Свабода». Лемяшонак панаракаў і на высокія тарыфы на распаўсюд газет поштай. «Напрыклад, «*Прессбол*», моцнае вельмі выданне, плануе перайсці толькі на інтэрнэт-фармат, таму што пошта заціскае тарыфамі», — адзначыў Лемяшонак. Ён заявіў таксама, што кіраваная ім газета не атрымлівае датацый. «У спісе як бы ёсць, але не атрымліваем», — сказаў рэдактар «Рэспублікі».

Быццам на апраўданне Лемяшонак распавёў, што дзяржаўныя СМІ, аказваецца, таксама інфармавалі сваіх чытачоў пра эканамічны крызіс у краіне.

«Многія папракаюць нас на апазіцыйных сайтах, у расійскіх СМІ, што беларуская журналістыка праспала эканамічную сітуацыю. Вы ведаеце, мы часам давалі альтэрнатыўныя думкі. Пагартайце і «*Советскую Белоруссию*», і «Народную газету», і «Рэспубліку». Вельмі часта мы пісалі пра гэта, прадказвалі гэтую сітуацыю, мы часам давалі альтэрнатыўныя думкі». Але, паводле слоў Лемяшонка, гэта трэба было рабіць «не так ціха». «Яскрава, гучна, больш прыкметна. Тут стаіць пытанне аб нейкай лібералізацыі на медыйным полі. Мы павінны крышку ўзяць на сябе адказнасць. Ну, палаюць нас за нешта, напэўна, што тыя ж рэдактары дапусцілі, але не трэба баяцца гэтага. Таму што мы сапраўды праспім усё, што можна», — сказаў Анатоль Лемяшонак. Трэба нагадаць, што сітуацыя ў беларускай эканоміцы надзвычай складаная, па краіне ўжо не адназразова лакальна ўспыхвалі пратэстныя бунты. Але ці піша пра гэта «Рэспубліка»?



### ВОЛЬГА ГАВАРЦОВА

Беларуска Вольга Гаварцова (35-е месца ў парным рэйтынгу) і расіянка Ала Кудраўцава (43) выйгралі тэнісны турнір у Бірмінгеме (Вялікабрытанія) з прызавым фондам 220 тысяч долараў ЗША.

12 чэрвеня ў вырашальным матчы дуэт з лікам 1:6, 6:1, 10:5 (тай-брэйк) выйграў у італьянак Сары Эрані (34) і Раберты Вінчы (40). Гэта шосты тытул 22-гадовай ураджэнкі Пінску ў парным разрадзе турніраў ВТА (у сямі фіналах).

Упершыню Вольга прыняла ўдзел у прафесійным тэнісным турніры ў 14 гадоў (у Мінску, турнір Міжнароднай федэрацыі тэніса ITF). У тым жа годзе заваявала прэстыжны юніёрскі тэнісны трафей *Orange Bowl* ва ўзроставай катэгорыі да 14 гадоў. Свой кар'ерны ўзлёт Гаварцова каментавала такімі словамі: «Я не лічу, што здзейсніла нейкі цуд. Рана ці позна гэта павінна было адбыцца, бо я старанна працавала. Яшчэ калі была юніёрам, я гуляла нядрэнна, была ў дзясятцы».

Гаварцова ў тэнісе з 6 гадоў. Мэтай кар'еры ставіць уваход у Top–10 рэйтынгу WTA.




### АЛЕСЬ АСТРОЎСКІ

Быць беларусам у Беларусі — гэта праца, а не толькі факт паводле запісу ў дакументах. Алесь Астроўскі, бацька гродзенскай школьніцы, дамагаўся, каб у горадзе быў створаны беларускамоўны клас, каб яго дачка мела магчымасць вучыцца ў сваёй краіне на роднай мове. І вось сёлета на базе 32-й школы, дзе па-беларуску вучыцца дачка Астроўскага, будуць створаныя першы і другі беларускамоўныя класы.

— У кожнай гарадской школе можа быць некалькі заяў на беларускамоўнае навучанне, але, каб утварыць клас, неабходна хаця б 10 дзяцей. Ва ўпраўленні адукацыі нам кажуць, што адкрыць беларускі клас магчыма ў любой школе, былі б жадаючыя. Каб не распыляцца, мы пакуль абралі базавай 32-ю школу (на Дзевятоўцы), дзе скончыла першы і пойдзе ў другі клас адзіная ў Гродне вучаніца, якой шэраг прадметаў выкладаецца на беларускай мове. Адміністрацыя школы да адкрыцця беларускіх класаў ставіцца прыязна, сама запрашае. Падчас анкетавання на бацькоўскім сходзе бацькі шасці будучых вучняў СШ №32 выказалі жаданне аддаць сваіх дзяцей у класы з беларускай мовай навучання, аднак гэтай колькасці недастаткова, — цытуе старшыню гродзенскай абласной арганізацыі ТБМ Алеся Кроя інтэрнэт-рэсурс «Твой стыль».

Беларускамоўнай адукацыі летась для сваёй дачкі дабіўся карэнны гарадзенец, доктар медыцынскіх навук, прафесар Алесь Астроўскі. Як бачым, справа спадара Астроўскага можа мець працяг. Але не без намаганняў беларусаў.

ТРЭЦІ СЕКТАР

# ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ

Аляксандр ТАМКОВІЧ



**Першыя дзве спробы напісаць гэты нарыс былі зроблены яшчэ паўгода таму. Па тэлефоне мы нават дамаўляліся з Віталем пра сустрэчы, але па зразумелых прычынах яны не адбыліся. На жаль, і не адбудуцца. Застаецца толькі прачытаць у фэйсбуку, што напісаў пра сябе сам Віталь Сіліцкі — «звычайная біяграфія ў незвычайны час».**

## Пачатак асобы

Віталь Сіліцкі нарадзіўся 25 снежня 1972 года ад Нараджэння Хрыстова. А пайшоў з жыцця 11 чэрвеня 2011 года — напярэдадні свята Святой Тройцы. Пагадзіцеся, не заўважыць гэтага супадзення немагчыма.

Раней Віталь Сіліцкі лічыў сябе агностыкам. Нагадаем, у адрозненне ад атэістаў, яны цалкам не адмаўляюць Боскае паходжанне свету, а проста лічаць, што мы гэтага дакладна ведаць не можам.

Але за некалькі тыдняў да смерці ён запрасіў да сябе беларускамоўнага праваслаўнага святара. Іх размова сам на сам не была кароткай. Яшчэ раз ён паклікаў святара літаральна за некалькі гадзін да адыходу ў іншы свет.

Шлях у актыўнае жыццё для кожнага пачынаецца з пытання выбару прафесіі. Віталь адказаў на яго, наколькі ведаю, без ваганняў — сацыялогія. Не буду лішні раз узгадваць адмоўныя «крылатыя фразы» пра сацыялогію, адзначу толькі, што даволі часта людзі на патрэбу пэўнай ідэалогіі трактуюць яе "як трэба", у чым самі лічбы абсалютна невінаватыя. Магчыма, Віталь Сіліцкі і вырашыў стаць сацыёлагам, каб супрацьстаяць гэтай тэндэнцыі.

На аддзяленне сацыялогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Віталь Сіліцкі паступіў у 1989 годзе, а паспяхова скончыў у 1994-м.

Гэты быў час, калі адбыліся падзеі, што і абумовілі потым «пераўтварэнне» сацыёлага ў палітолага.

## Пачатак паліталогіі

Па вялікім ж рахунку, сам працэс «пераўтварэння» быў даволі ўмоўным, бо менавіта сацыялогію можна назваць «інструментам» паліталогіі.

Пасля атрымання дыплома БДУ Віталь Сіліцкі вырашыў не спыняцца і працягваць вучобу. Спачатку быў Цэнтральна-Еўрапейскі ўніверсітэт (Будапешт, Вугоршчына), потым Ратгерскі Універсітэт (Нью-Джэрсі, ЗША), у якім ён і атрымаў ступень доктара паліталогіі. Было гэта ў 1999 годзе.

Амаль адразу Сіліцкага прызначылі дацэнтам Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, які на той час яшчэ месціўся ў Мінску, а ўжо ў 2003 годзе звольнілі. Як кажуць у такіх выпадках, «па палітычных прычынах». Дакладней, быў адпаведны ціск на кіраўніцтва ўніверсітэта з боку ўладаў. Прычына — публічная крытыка Сіліцкім палітыкі прэзідэнта краіны.

Тры гады Віталь Сіліцкі працаваў як незалежны эксперт. У 2006 годзе яго запрасілі на стажыроўку ў Міжнародны форум даследаванняў дэмакратыі (Нацыянальны фонд у падтрымку дэмакратыі, ЗША) і Стэнфардскі ўніверсітэт. Праз год стажыроўка скончылася, і ён вярнуўся на радзіму, каб прыняць удзел у стварэнні Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (BISS).

## Пачатак платформы

Каб было зразумела, пра якую платформу ідзе гаворка, працытую іх інтэрнэтаўскую старонку: «Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў (BISS) гэта платформа для дыялогу ўнутры беларускай аналітычнай супольнасці і мост паміж экспертамі, беларускім грамадствам і міжнароднай супольнасцю. Шляхам даследаванняў, публікацыяў і развіцця беларускай экспертнай супольнасці BISS ставіць на мэце сфармаваць новае бачанне Беларусі. Інстытут распрацоўвае і прапануе пазітыўныя альтэрнатыўныя сцэнары палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай трансфармацыі краіны, а таксама шукае шляхі падвышэння канкурэнтаздольнасці Беларусі і дабрабыту яе грамадзян».

Хаця і стварылі яго ў 2007 годзе ў Мінску, зарэгістравалі ў Вільнюсе. Чаму? Апошнія гады ў Беларусі атрымліваюць афіцыйнае «дабро» ў пераважнай большасці толькі «чэсныя» структуры, у разуменні ўладаў, гэта арганізацыі, якія адстойваюць менавіта іх пазіцыю. Нават калі яна відавочна нелагічная.

Сярод заснавальнікаў інстытута — сем выдатных прадстаўнікоў розных галінаў нашай жыццёвай дзейнасці. Пералічваць іх не буду. Скажу толькі, што кожны — Асоба.

Адзін з сяброў напісаў мне, што абрэвіятура BISS супадае з назвай галоўнай чэшскай спецслужбы. Жарт, канешне, але, калі задумацца, то ёсць тут і нешта агульнае — глыбока капаюць.

Не буду пералічваць усе палітапагічныя артыкулы або выступы Віталя Сіліцкага, бо гэта з-за вельмі вялікай колькасці немагчыма фізічна. Адзначу толькі, што гэта быў Палітолаг з вялікай літары, слову якога давяралі, высновам якога — верылі.

Сярод галоўных напрамкаў дзейнасці BISS можна выдзеліць правядзенне эканамічных, палітычных і сацыялагічных даследаванняў; публікацыю перыядычных маніторынгаў эканамічнай лібералізацыі, прыватызацыі і інвестыцый, дыялогу Беларусі і ЕС; правядзенне экспертных круглых сталоў і канферэнцыяў; адміністраванне Беларускага фонду публічнай палітыкі (БФПП); публікацыя Беларускага Штогадовіка; публікацыя «BISS Trends»; адміністраванне стыпендый BISS.

Як вы разумееце, гэты пералік я ўзяў з сайта Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў. Да мінулага года яго ўзначальваў Віталь Сіліцкі, а потым саступіў пасаду выканаўчага дырэктара Таццяне Кузінай, пакінуўшы за сабой навуковае кіраўніцтва.

## Пачатак выпрабаванняў

У ліпені 2010 года для Віталя Сіліцкага ўпершыню прагучаў страшны дыягназ — рак правай ныркі. Дактары паспяхова яе выдалілі, што пацвердзілі ўсе аналізы, якія былі зроблены праз тры месяца. Але…

У студзені хвароба вярнулася метастазамі. Шмат людзей шчыра імкнуліся дапамагчы Віталю Сіліцкаму. Найперш паплечнікі па рабоце і шматлікія сябры самых розных асяродкаў дэмакратычнай беларускай супольнасці. Гэтак сама арганізацыя «Pact», офіс «За дэмакратычную Беларусь», якія для його лячэння адкрылі банкаўскія рахункі ў Бельгіі і ў Украіне. Менавіта ахвяраванні ад шматлікіх сяброў і калег і сталіся фінансавым падмуркам для лячэння Віталя.

Пра офіс «За дэмакратычную Беларусь» хачу сказаць асобна. Час ад часу даводзілася чуць, як некаторыя «тытульныя» палітыкі даволі настойліва крытыкуюць яго за адыход ад дэмакратычных каштоўнасцяў. Маўляў, у сваёй дзейнасці замежны офіс робіць акцэнт не на тое, што сёння перш за ўсё хвалюе Беларусь. Асабіста мне такая пазіцыя абсалютна не зразумелая. Перакананы, ад канкрэтнай дапамогі плёну больш, чым ад некаторых пікетаў і семінараў.

Выпадак з Віталем Сіліцкім — красамоўнае таму пацвярджэнне. Гэта была канкрэтная дапамога, што запамінаецца лепш, чым бясконцыя абстрактныя размовы пра нейкія каштоўнасці. Знакавае супадзенне па часе і форме праяўленне салідарнасці (праз збор сродкаў): канкрэтная дапамога аднаму з лідараў дэмакратычнай супольнасці — ахвяры смяротнай хваробы і такая ж дапамога — арыштаваным і асуджаным удзельнікам падзей 19 снежня, ахвярам рэжыму.

Сабраныя сродкі дазволілі Віталю Сіліцкаму правесці ў Брусэлі, у адной з найлепшых клінік па анкалогіі ў Еўропе, неабходную дыягностыку, зрабіць там аналізы, якіх няма ў арсенале беларускіх медыкаў.

На жаль, не дапамагло…

## Пачатак пачатку

Разам з Віталем Сіліцкім у замежнай паездцы мы былі толькі адзін раз, калі ў славацкай амбасадзе ў Брусэлі сярод іншага прэзэнтавалі мае кнігі. Уразіла, што падчас чакання самалёту (у Варшаве была перасадка) ён адразу ж шукаў не «Дзьюці фры», а разетку, каб падключыць свой ноўтбук. І над чымсьці з захапленнем працаваў. Мабыць, пачынаў пісаць новы артыкул, бо Віталь Сіліцкі быў чалавек, які заўсёды нешта пачынае.

Некаторы час таму праект *TUT. BY/ Budzma.org* у цыкле «Быць беларусам: што гэта значыць?» правадзіў масавае анкетаванне. Была сярод іх і анкета палітолага Віталя Сіліцкага, які на гэта пытанне адказаў так: жыць у Беларусі, размаўляць па-беларуску, дбаць пра Беларусь, любіць Беларусь.

Завяршыць жа нарыс хацелася б словамі, якія былі сказаны Віталем тры з паловай гады таму. Гэта з тых выпадкаў, калі кажуць — як у ваду глядзеў:

«Дэмакратычная апазіцыя і незалежнае грамадства пакуль застаюцца закладнікамі руцінізаванай безнадзейнасці. Варыянту таго, што дэмакратычны супрацiў у бліжэйшы час будзе магчымы выключна ў дысідэнцкіх формах, унікнуць нельга. Фактарам падтрымання надзеі ў такіх варунках можа стаць толькі нашая перакананасць у тым, што індывідуальны супраціў — гэта самае галоўнае ў такіх абставінах, што ён непазбежна прынясе плён, што канструкцыя карпаратыўнай дзяржавы нявечная. Дысідэнт усё ж такі мае адну перавагу, якую не здольны адняць ніякія рэпрэсіі, — ён бачыў і ведае, як руйнуюцца дыктатуры».

Упэўнены, Віталь Сіліцкі гэта таксама абавязкова ўбачыць, бо я перакананы, што чалавечае жыццё не заканчваецца на гэтым свеце…

# СЛОВА НА РАЗВІТАННЕ

**З уласцівай яму самаіроніяй Віталь Сіліцкі назваў сваю біяграфію звычайнай у незвычайны час. І ўсё ж гэта незвычайная біяграфія.**

Не таму, што яна была абарвана цяжкай хваробай усяго толькі на 38-м годзе жыцця, у росквіце сіл і таленту. А таму, што гэта біяграфія чалавека выбітных здольнасцяў, вострага аналітычнага розуму. Чалавека, які за свой несправядліва кароткі век паспеў здзейсніць неверагодна шмат. Ён адчуваў час і разумеў сваё ў ім прызначэнне. Без высокіх слоў і гучных прэтэнзій ён закладваў падмурак новай постсавецкай беларускай паліталогіі.

У сваіх артыкулах, дакладах і выступах на навуковых канферэнцыях, практычных семінарах і круглых сталах, шматлікіх інтэрв'ю і каментарах на старонках СМІ, на радыё і тэлебачанні. У практычнай дзейнасці, як аўтар ідэі і архітэктар праекта па стварэнні Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (BISS), як навуковы кіраўнік інстытута.

У супрацiве абставінам, насуперак рэакцыйнай палітычнай хвалі, што адкідала Беларусь назад у таталітарнае мінулае. Віталь Сіліцкі працаваў на будучую Беларусь — свабодную і дэмакратычную. Ён ведаў, што момант гэтага пераходу ўжо блізкі.

Менавіта пад гэтым вуглом бачання мы абмяркоўвалі з ім публікацыю серыі яго артыкулаў у «Новым часе» напрыканцы мінулага года, калі ён яшчэ не ведаў, што страшная хвароба дала рэцыдыў. Да гэтай ідэі мы яшчэ раз вярнуліся зусім нядаўна, калі ён ляжаў у шпіталі. На вялікі жаль, да гэтага моманту Віталь не дажыў.

Ён змагаўся да апошняга. І ў тым яму, чым маглі, і нават звыш таго, дапамагалі сябры, таварышы, паплечнікі. Найперш па BISS, але і далёка не толькі. За яго, з ім перажывалі, па сутнасці ўсе асяродкі беларускай дэмакратычнай супольнасці. Так здараецца толькі ў адносінах тых, каго сапраўды любяць і паважаюць.

На трагічнай мяжы яго зыходу ў іншы свет бачыцца бясспрэчным, што на скрыжалях найноўшай гісторыі Беларусі імя Віталя Сіліцкага ўжо занатавана як імя аднаго з выбітных дзеячаў беларускага дэмакратычнага руху пачатку XXI стагоддзя. Як імя мысляра і вучонага — заснавальніка сучаснай беларускай паліталогіі.

А ў памяці тых, хто яго ведаў, яшчэ як і проста добрага чалавека.

**Аляксей Кароль**

МЕРКАВАННЕ

# ХТО «ШАРАХНЕ» ПЕРШЫ?

Працяг. Пачатак на стар. 1.



На памежным пераходзе «Варшаўскі мост»

У Беларусі адбылося рэзкае пагаршэнне матэрыяльнага становішча насельніцтва. Пра гэта сведчаць дадзеныя апытання, праведзенага 10–20 мая 2011 года Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД). Амаль палова апытаных (40,3%) заявілі, што заробленых грошы «ледзь дазваляюць» нармальна харчавацца. Амаль чвэрць беларусаў (24,2%) не можа сабе дазволіць набываць адзенне і абутак і 51,3% ледзь дазваляюць сабе гэта рабіць. За правядзенне рынкавых рэформаў выступілі 66,7% апытаных. У праблемах з замежнай валютай палова апытаных вінавацяць улады, якія праводзяць дрэнную эканамічную палітыку.

Напачатку чэрвеня Нацыянальны статыстычны камітэт паведаміў, што інфляцыя ў маі ў параўнанні са снежнем 2010 года вырасла на 25,4%. Напрыканцы мая была праведзеная дэвальвацыя рубля амаль на 55%, а намеснік міністра эканомікі Беларусі Андрэй Тур заявіў, што ўрад плануе рост інфляцыі да канца года на ўзроўні 33–39%. Сітуацыю ў краіне чыноўнік ахарактарызаваў як «дастаткова складаную». «У нас рэзкая дэвальвацыя справакавала інфляцыю, таксама даволі высокую», — сказаў намеснік міністра эканомікі.

Не падзяляе грамадства і пазіцыю ўлады наконт затрыманых і асуджаных удзельнікаў акцыі пратэсту ў снежні 2010 года. Паводле апытання НІСЭПД, 28% рэспандэнтаў мяркуюць, што асуджаныя ні ў чым не вінаватыя, амаль 25% сказалі, што абвінавачаным вынеслі занадта суровыя прысуды, і прыкладна столькі ж прытрымліваюцца думкі, што прысуды адпавядаюць віне.

Пытанні наконт выбуху ў метро паказалі, што міфу пра стабільнасць больш не існуе: 69,5% рэспандэнтаў упэўненыя, што тэракты ў Беларусі могуць паўтарыцца ў будучыні. Больш за палову апытаных (54,7%) не вераць у афіцыйную версію здарэння. Паводле дадзеных сацапытання, 22,4% рэспандэнтаў выказаліся, што да тэракту ў мінскім метро датычныя беларускія ўлады, а 24% мяркуюць, што наступствы выбуху найбольш выгадныя беларускім уладам.

Цікава, што на пытанне «Калі масавыя выступы, акцыі пратэсту, страйкі адбудуцца ў населеным пункце, дзе вы жывяце, вы асабіста прымеце або не ў іх удзел?» 8,2% рэспандэнтаў адказалі станоўча, 76,5% — адмоўна, а 15,3% не змаглі вызначыцца з адказам. Аднак грамадзянскія пратэсты ўспыхваюць па ўсёй краіне, хаця пакуль і не ў катастрафічных маштабах. У сацыяльных сетках па-ранейшаму ідзе заклік выходзіць на цэнтральныя плошчы гарадоў кожную сераду, і гэтая ідэя знаходзіць новых прыхільнікаў.

**Грамадзянскія пратэсты ўспыхваюць па ўсёй краіне. У сацыяльных сетках па-ранейшаму ідзе заклік выходзіць на цэнтральныя плошчы гарадоў**

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька гаворыць, што апазіцыі пакуль не час актыўна ўмешвацца ў працэс, але тое, што адбываецца, яму падабаецца.

«Сітуацыя мае перспектыву, іншую якасць, чым раней. Тое, што адбываецца, мне падабаецца. Калі інтарэсы адстойвае толькі арганізаваная апазіцыя, то гэта для ўлады прагназуема: людзі на ўліку і ўлады падрыхтаваныя. Калі ж працэс ідзе ад неарганізаваных груп, то ўладам трэба час для адаптацыі, каб наладзіць кантроль, мабілізаваць рэсурсы. Тыя акцыі, што мелі месца, адбываліся і з удзелам прадстаўнікоў апазіцыі. Але мы самі гаворым нашым сябрам партыі, каб не ішлі з партбілетам, партыйным штандарам, — дзеліцца меркаваннем наконт тэхналогій пратэсту лідар АГП. — Яны мусяць дзейнічаць як і людзі, што выказваюць рэакцыю на сацыяльныя выклікі. Праз нейкі час яны могуць заявіць пра сваю палітычную прыналежнасць, скіраваць людзей у фармат акцыі ўсёй краіны, заявіць пра палітычныя праблемы. Калі б мы пасправабавалі «прыватызаваць» гэты працэс, то апазіцыя прайграла б. Бо, калі гэта адбываецца не пад ярка акрэсленым апазіцыйным сцягам, то ў грамадзян выклікае больш пазітыўныя эмоцыі».

Лябедзька не прагназуе на лета істотных катаклізмаў, адно гаворыць, што «восенню будзе горача». «Пакуль арганізатарам пратэстаў выступае сама ўлада. Думаю, што і надалей яна будзе матываваць людзей да дзеянняў», — рэзюмуе палітык.

## Надзвычайнае становішча

У звязку з пратэстнымі настроямі ці не, але Савет міністраў Беларусі 8 чэрвеня прыняў пастанову № 734, якая рэгулюе ўлік асобаў, што ўдзельнічаюць у забеспячэнні рэжыму надзвычайнага становішча ў краіне. Дакумент, падпісаны першым віцэ-прэм'ерам Беларусі Уладзімірам Сямашкам, прыняты ў адпаведнасці з артыкулам 21 закону Рэспублікі Беларусь ад 24 чэрвеня 2002 года «Аб надзвычайным становішчы».

Раней заканадаўча не былі рэгламентаваны асобныя працэдуры, звязаныя з рэжымам надзвычайнага становішча. Дакументам агаворваецца ўлік супрацоўнікаў сілавых структур і ведамстваў, а таксама іншых грамадзян краіны, што ўдзельнічаюць у забеспячэнні рэжыму надзвычайнага становішча. Для гэтага будуць збірацца іх анкетныя дадзеныя, звесткі аб перыядзе іх удзелу ў забеспячэнні рэжыму надзвычайнага становішча, а таксама звесткі, неабходныя для прадастаўлення прадугледжаных заканадаўствам гарантый і кампенсацый. Дакумент, з тэкстам якога можна азнаёміцца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання. Сам рэжым надзвычайнага становішча ўводзіцца ўказам прэзідэнта.

Палітычны аглядальнік Раман Якаўлеўскі гаворыць, што пакуль рана панікаваць і рабіць далёкія высновы. «Фармальна гэта можа тычыцца і магчымых прыродных, тэхнагенных катаклізмаў, але нельга не ўлічваць і другія магчымыя прычыны правапрымянення, як, напрыклад, сацыяльная напружанасць», — зазначае эксперт. Спадар Якаўлеўскі патлумачыў, што надзвычайнае становішча можа ўводзіцца ці на тэрыторыі ўсёй краіны, ці на яе частцы. Надзвычайнае становішча прадугледжвае абмежаванне канстытуцыйных правоў, напрыклад, забарона на выезд за мяжу, забарона сходаў, поўнае падпарадкаванне кіруючым органам.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# НАБЛІЗІЛАСЯ ДА МЯЖЫ



**Здаецца, такога раней не было, бо не магло быць ніколі. Маю на ўвазе пікетаванне грамадзянамі дзяржаўнай мяжы ў пунктах мытнага кантролю. Той мяжы, што была «на замку», лічылася «свяшчэннай і недатыкальнай». А зараз — на табе. Амаль што рэвалюцыя.**

Дарэчы, восенню 1990 года ў ціхім і, як да гэтага часу падаецца многім, правінцыйным Мінску ўзбунтаваліся курцы. Перакрылі Ленінскі праспект насупраць фірмовай крамы «Тытунь», бо там не было ўжо ні адмысловых гатункаў, ні звычайных «Прымы» з «Астрай». Рэвалюцыя не рэвалюцыя, бунт падсвядомы і ў чымсьці бязлітасны. Савецкую ўладу, якая пазбавіла людзей самых простых жыццёвых радасцяў, проста ўзненавідзелі. Не ўсе, зразумела. Але актыўная частка насельніцтва, якой смяротна надакучылі кіламетровыя чэргі.

Вось і зараз народ пачаў цікавіцца палітыкай. З аб'екта медыйных маніпуляцый ператварыўся ў суб'екта палітычнага дзеяння. Гэта «жывая творчасць мас» вытварае такія незвычайныя формы пратэсту, як узгаданае вышэй пікетаванне дзяржаўнай мяжы або акцыя «Стоп-бензін». Без пасярэдніцтва палітычных партый, прафсаюзаў, грамадскіх арганізацый. Як гэта было напачатку 1990-х гадоў, калі людзі верылі, што маюць права пратэставаць. І зараз, відаць, прыпякло.

Падаецца, што ўлады не зусім разумеюць сітуацыю. Прыкладам, працягваюць татальную зачыстку палітычнай прасторы, падбіраючы апошніх актывістаў ды журналістаў. Быццам бы за абразы ўладаў, асоб і дзяржінстытуцый. Хто ж у гэта паверыць? Некалі прадстаўнікі розных дзяржаўных устаноў ды органаў кпілі з людзей, якія спрабавалі адстаяць свае правы спасылкамі на Асноўны закон краіны. Вось дзе рогат стаяў. Апаганілі і тую Канстытуцыю, і парламент, і прэзідэнта. Па закону бумеранга. Прыкладам, артыкулы Канстытуцыі, якія гарантуюць нам розныя дэмакратычныя правы і свабоды, і выкананне якіх дзяржаўнымі асобамі і ўстановамі забяспечваецца прэзідэнтам краіны.

А сёння дастаткова сказаць, што прэзідэнт — гарант нашых правоў, і можна рагатаць да слёз.

Хто ж вінаваты, што палітыка ў краіне падобная на дрэнны вадэвіль, у якім дамінуе ўсё той жа састарэлы герой-палюбоўнік? Насуперак законам жанру, яму ўжо і каханкі не патрэбныя. Усё спрабуе зрабіць сам.

Ключавыя словы — несанкцыянаваныя акцыі. Улады ад людзей чакаюць любові, а тыя садзяцца ў аўтамабілі, загружаюцца таварамі і едуць прэч з сацыяльна арыентаванай дзяржавы. Невялікія набыткі, але якія ёсць. Большых пры гэтай уладзе не было і не будзе. А есці трэба кожны дзень. Як некалі казаў слынны сацыёлаг Піцірым Сарокін, натоўп крычыць адной вялікай глоткай, але кожны есць паасобку. Калі нешта ёсць. Гэта акцыя несанкцыянаваная і несппланаваная, натуральная і таму маючая моц абсалютнага закона.



Людзі ўжо і газет не чытаюць, і тэлебачанне не глядзяць. Навошта? Усю патрэбную на дадзены момант актуальную інфармацыі даюць цэннікі ў крамах. Чытай і ўспамінай, што некалькі тыдняў таму быў чалавекам адносна заможным, а сёння стаў амаль жабраком. Каб гэта злодзей зрабіў ці рабаўнік, то можна было і ў суд падаць. Але ж гэта ўтварыў урад гаранта нашых сацыяльна-эканамічных правоў. Іншы б на яго месцы папрасіў публічнага прабачэння, што так усё атрымалася, ды паціху сышоў. Але толькі не ён.

Ужо загаманілі пра надзвычайнае становішча. Пракуратура папярэджвае грамадзян краіны пра недапушчальнасць парушэння заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. Маўляў, гэта супярэчыць прынцыпам любой прававой дзяржавы. Дык чаму ж тады ў «любой прававой дзяржаве» людзі маюць магчымасць выказаць абурэнне дзеяннямі розных «гарантаў», а ў нас не? Чаму нашы праваахоўнікі глядзяць толькі ў бок грамадзян, а ў процілеглы нават зірнуць баяцца? Чаму ў нас усе мерапрыемствы толькі несанкцыянаваныя?

Адказ просты — таму што па закону ў нас дзейнічае толькі адзін чалавек. Што б ні зрабіў, усё адразу кадыфікуецца. Прыкладам, паабяцаў не дапусціць у Беларусі страйкаў ды незапланаваных акцый. Зрабіць гэта можна — ёсць розныя шляхі і падыходы. Можна дамаўляцца з прафсаюзамі ў рамках сацыяльнага партнёрства, можна праз усталяванне льгот для самых бедных слаёў насельніцтва, можна праз палітычную лібералізацыю дамагчыся крэдытаў ды распачаць рынкавыя рэформы. Можна абмеркаваць Канстытуцыю і зліквідаваць інстытут прэзідэнцтва як патэнцыйна небяспечны ў краіне з няўстойлівай дэмакратыяй.

Усё можна, спосабаў не злічыць. Але толькі не ў нас. У нас толькі «шарахнуць».

Можна сказаць абсалютна дакладна: сёння інфармацыя па краіне распаўсюджваецца з хуткасцю «сарафаннага радыё», якое дзейнічае не менш хутка і красамоўна, чым той жа інтэрнэт. Усё на гэтым свеце мае межы, а дзяржаўная прапаганда наблізілася да іх.

СПРАВА

# ЖУРНАЛІСТА СУДЗЯЦЬ ЗА АБРАЗУ САМОГА

Вольга ХВОІН

**У Гродна пачаўся закрыты працэс па справе журналіста Андрэя Пачобута. Яго абвінавачваюць па двух артыкулах Крымінальнага кодэкса Беларусі: паводле часткі 1 артыкула 368 (абраза прэзідэнта Беларусі) і паводле часткі 1 артыкула 367 (паклёп у дачыненні да прэзідэнта). Максімальнае пакаранне паводле першага артыкула — чатыры гады пазбаўлення волі, паводле другога — два гады. Андрэй Пачобут сваім родным сказаў рыхтавацца да горшага.**

## Годны нягоднік

Крымінальную справу на журналіста польскай «Gazety Wyborczej» Андрэя Пачобута распачалі напрыканцы сакавіка. Яму інкрымінуюць публічную абразу кіраўніка Беларусі — у тэкстах, напісаных і змешчаных у інтэрнэце на сайтах *wyborcza.pl*, *belaruspartisan.org* і *poczobut.livejournal.com* на працягу 2010–2011 гадоў. 6 красавіка Андрэя спачатку затрымалі на трое сутак, а потым меру стрымання змянілі з падпіскі аб нявыездзе на ўтрыманне пад вартай. Чаму менавіта Андрэй? У Беларусі працуюць сотні журналістаў, і далёка не ўсе пяюць гімны хвалы кіраўніцтву дзяржавы. «Андрэй — прадстаўнік Саюза палякаў, думаю, гэта асноўная прычына. Гэта робіцца, каб ліквідаваць, ізаляваць людзей, і ўжо потым распраўляцца надалей з арганізацыяй», — гаворыць Аксана, жонка Андрэя Пачобута.

Пераслед журналіста за яго прафесійную дзейнасць журналісцкая супольнасць Беларусі сустрэла з абурэннем і насцярогай. Прэзідэнт — цяпер за крытыку ўладаў можна заляцець на нары з фармуліроўкай «паклёп і абраза».

Аднак рэдактар саўмінаўскай газеты «Рэспубліка» і старшыня Беларускага саюза журналістаў Анатоль Лемяшонак такіх апасенняў не падзяляе. «Нядаўна даваў інтэрв'ю «Еўрапейскаму радыё для Беларусі», там усё павярнулі, перавярнулі. Чаму Пачобутам вы не займаецеся, не ратуеце, не дапамагаеце? Я пацікавіўся гэтым пытаннем, дык мне сказалі, што там — чыстая крымінальшчына», — цытуе Лемяшонка БелаПАН. «Калі абсалютна лаяльны да ўлады Аляксандр Варламаў (дызайнер, мадэльер, арганізатар фестывалю «Млын моды» — рэд.) трапіўся на такіх момантах, якія яму прад'яўляюць (не ведаю, чым там скончыцца). Ён абсалютна лаяльны да ўлады, ён не апазіцыянер, але яго ж таксама збіраюцца судзіць. То чаму з іншых, вашых прадстаўнікоў, павінны зрабіць палітычных пакутнікаў? — абураўся Лемяшонак. — Ведаем мы гэтыя гульні, ну гуляць — гуляйце. Але нават у гульнях, дзіцячых, дарослых, мусіць быць нейкі ўзровень прыстойнасці. Калі мы не можам быць інтэлігентнымі людзьмі, то хаця б годнымі».



Аксана Пачобут з дачкой Янай каля будынка суда

Аднак міжнародныя журналісцкія арганізацыі нягодных складнікаў у дзейнасці Пачобута не знайшлі. Праваабарончая арганізацыя «Камітэт абароны журналістаў» (CPJ, ЗША) запатрабавала спыніць судовы пераслед і вызваліць гродзенскага карэспандэнта польскай «Gazety Wyborczej» Андрэя Пачобута. «Гэта абуральна, што журналіста ў Еўропе ў XXI стагоддзі судзяць пры зачыненых дзвярах толькі за тое, што ён пісаў крытычныя артыкулы пра абранага лідара. З Андрэя Пачобута павінны зняць усе гэтыя палітызаваныя абвінавачванні і вызваліць», — цытуе намесніка дырэктара CPJ Роберта Махоні агенцтва БелаПАН.

«Рэпарцёры без межаў» патрабуюць зрабіць усе слуханні па справе Пачобута адкрытымі, «пакуль абвінавачванні супраць Пачобута не знятыя». Тое, што на суд 14 чэрвеня не змаглі трапіць журналісты, «не пакідае практычна ніякіх надзеяў на справядлівы суд», — лічыць арганізацыя. «Суровасць абвінавачванняў, прад'яўленых Пачобуту на абсурдных падставах, з'яўляецца сведчаннем аўтакратычнага вар'яцтва, у якое прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка абрынуў сваю краіну», — гаворыцца ў заяве «Рэпарцёраў без межаў» ад 14 чэрвеня.

Нагадаем адзін паказальны эпізод з найноўшай гісторыі СМІ Беларусі. У 2006 годзе ў газеце «Згода», якую Аляксандр Сдвіжкоў падпісаў да друку, былі перадрукаваныя скандальныя карыкатуры на прарока Мухамеда з дацкай газеты. Журналіста абвінавацілі ў «распальванні рэлігійнай варожасці», судовы працэс таксама быў закрытым. У выніку «Згода» была ліквідаваная рашэннем Вярхоўнага суда, а Сдвіжкова пакаралі трыма гадамі пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Сдвіжкоў адседзеў тры месяцы, яго вызвалілі з турмы, калі пад ціскам Захаду Лукашэнка адпусціў на свабоду ўсіх палітвязняў.

## Прысуд не гатовы

14 чэрвеня за зачыненымі дзвярыма (на працэс не пусцілі і жонку Андрэя Пачобута) суд заслухаў некалькіх экспертаў, якія аналізавалі «крымінальныя» тэксты Пачобута. Як паведамляе служба маніторынгу БАЖ, экспертамі на судзе былі выкладчык-філолаг Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксей Нікіценка, а таксама двое супрацоўнікаў аддзелу ідэалогіі Гродзенскага аблвыканкама — Павел Скрабко (загадчык) і Віктар Жалезняковіч (адказны за працу са СМІ). Напрыканцы першага дня суда пракурор заявіў хадайніцтва перанесці слуханні на 17-е чэрвеня, каб перакваліфікаваць абвінавачанні. Просьбу суддзя задаволіў. Абарона Пачобута заявіла хадайніцтва аб запрашэнні ў суд 12-ці сведак з боку абвінавачанага. «Адвакат сказаў, што ў ліку сведак Аляксандр Мілінкевіч, Лукашэнка, юрыст з БАЖу. Але суд адхіляе хадайніцтва аб запрашэнні сведак з боку абароны, — гаворыць Аксана Пачобут. — Пасяджэнне перанеслі — або проста цягнуць час, хочуць, каб да суда не прыходзіла столькі людзей на знак падтрымкі. Я думала, што яны ўжо ведаюць прысуд. Але, магчыма, яшчэ чакаюць нейкага загаду зверху».

Сустрэцца з мужам Аксана пасля першага судовага пасяджэння не мела магчымасці — Андрэя вывадзілі-вывозілі праз чорны ход у акружэнні міліцыі. Заставалася хіба што крычаць мужу словы праз агароджу. «Суддзя сказаў, што размаўляць са мной не будзе ўвогуле, толькі праз адваката, і толькі пасля працэсу», — расказвае Аксана Пачобут.

У інтэрнэт-дзённіку *poczobut.livejournal.com* перыядычна зямшчаюцца яго нататкі. Андрэй настроены на любы вырак, ілюзіяў не мае. Але і сілы духу не губляе ў турэмных сцэнах. «Сяджу я на 3-м паверсе СІЗА, паверхам ніжэй у 30-я гады сядзеў самы вядомы зняволены гродзенскай турмы — камуністычны тэрарыст і верны сталінец Сяргей Прыцыцкі. У далёкім 80-м годзе я пайшоў у першы клас школы, якая носіць яго імя. І зараз вось атрымаў унікальную магчымасць «пагасцяваць» у месцы яго «баявой славы». Увогуле, я не сумую, нават наадварот. Беларусь «турэмная» мала чым адрозніваецца ад Беларусі «свабоднай». Рэжым ёсць рэжым. І там у вас, і тут у мяне. Хіба, што тут, у турме, усё яшчэ больш скандэнсавана. З цікавасцю збіраю матэрыял для «посттурэмнага рэпартажу», хаця з'явіцца яму будзе наканавана праз некалькі гадоў, але запэўніваю вас, ад гэтага ён не стане менш цікавым», — напісаў пра павароты свайго лёсу Андрэй.

АКЦЫЯ

# УСЕНАРОДНЫ ПРАМЕНАД

Вольга ХВОІН

**Цётачкі з марожаным, дзяўчаты ў офісных строях і туфлях на абцасах, юнакі з заплечнікамі і ў шлёпанцах — вось пагроза рэжыму і спакою. Выйшлі прагуляцца, а супраць іх АМАП і стройныя шэрагі міліцыі, аўтазакі ў дварах прылеглых дамоў.**



Трэцяя па ліку акцыя пад назвай «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» прайшла ў сталіцы і абласных цэнтрах, буйных гарадах краіны. Гэтым разам улады крыху асэнсавалі, у чым «фішка», і зрабілі мноства захадаў, каб прадухіліць масавы збор людзей на цэнтральных плошчах гарадоў.

У Мінску ў раёне Кастрычніцкай плошчы сабралася некалькі тысяч маладых людзей. Але міліцыя загадзя ачапіла турнікетамі плошчу, перад Палацам рэспублікі была зладжаная паказальная «рэпетыцыя» фізкультурнікамі святочных нумароў параду 3-га ліпеня. Людзям не дазвалялі сабрацца ў адным месцы, натоўпы рассякалі і выціскалі на прылеглыя вуліцы. Брутальных разгонаў не было, ды і за што ганяць? Па гораду вячэрняя праменады пакуль быццам бы не забароненыя.

Вулічная акцыя прайшла ў запланаваным фармаце — без палітычных лозунгаў, сімволікі і патрабаванняў. Людзі з пазітыўным настроем прагуляліся, паапладзіравалі ракіроўкам міліцыянтаў і разышліся дадому. Арганізатары «Рэвалюцыі праз сацыяльныя сеткі» заклікаюць выходзіць кожную сераду на вуліцы гарадоў, колькасць удзельнікаў паступова павялічваецца, аднак да крытычнай масы яшчэ далёка. У абласных гарадах смелых прагулянцаў арганізавАным парадку было некалькі соцень. Аднак з імі не сталі цырымоніцца, і частку людзей упакавалі ў аўтобусы з міліцыяй. Агулам па рэспубліцы пасля народных гулянняў, па ацэнках праваабаронцаў, было затрымана больш за 240 чалавек. Некаторых з затрыманых супрацоўнікі праваапарадку моцна збілі.

Гэтым разам да сацыяльнага пратэсту далучыліся і такія гарады, як Пінск, Полацк, Светлагорск, Кобрын, Маладзечна ды іншыя. Колькасны склад там пакуль не ўражвае, але ў любым выпадку пэўныя браджэнні і зрухі відавочныя. Цяпер па заклiку «ВКонтакте» на вуліцу выходзіць у дзясяткі разоў больш людзей, чым у папярэднія гады на прапановы апазіцыі.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 20 ЧЭРВЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.00** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** «Дзелавое жыццё».
**08.30** Дак. серыял «Гараджане»: Мінск.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.00** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**12.10** Меладраме «Рыта» (Расія).
**13.45** Сінематэка.
**14.30** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Відэафільм АТН «Калумбія».
**16.05** Патрабуецца.
**16.20** Дак.-біяграфічны цыкл «Мая праўда».
**17.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 01.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама».
**21.40** «Камандзіроўка».
**21.55** «Падполле супраць Абвера». Мастацка-публіцыстычны фільм (Беларусь). 1-я і 2-я серыі.
**23.10** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**00.45** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**01.15** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Участак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.10** «Крэпасць». Шматсерыйны фільм.
**23.10** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.40** «Бежанцы ў Беларусі».
**00.25** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.15** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.40** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** Фільм «Тата». Расія, 2004 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

### ЛАД

**07.00** «ЛАДная раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Пра мастацтва.
**09.30** «Навіны надвор'я».
**10.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**11.10** Страсці па культуры.
**11.50** Баявік «Маёр Вятроў». 1-я і 2-я серыі.
**13.50** «Бежанцы ў Беларусі». Дак. фільм.
**14.30** Пазакласная гадзіна.
**15.05** «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.25** Камедыя «Знаёмства з Маркам» (ЗША).
**20.55** Калыханка.
**21.10** Тэлебарометр.
**21.15** КЕНО.
**21.20** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Чэхія-Беларусь. Прамая трансляцыя.
**23.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**00.10** Бітва экстрасэнсаў.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Пакой смеху».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Здагадайся. Выратуй. Юры Візбар». Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**22.15** Тэлесерыял «Правілы згону».
**23.10** «Нічога асабістага».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі.ru».
**00.00** Прэм'ера. «Гарадок».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.10** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейныя».
**21.25** Вострасюжэтны серыял «Лютасць».
**23.35** «Сумленны панядзелак».
**00.20** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Раўнд 10-ы (Брно, Чэхія).
**10.45** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Англія - Руанда (Мексіка).
**11.45** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Узбекістан - Новая Зеландыя (Мексіка).
**12.30, 17.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Уругвай - Канада.
**14.00, 18.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. ЗША - Чэхія (Мексіка).
**15.15** Тэніс. «Матс поінт». Часопіс.
**15.45, 20.30** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. (Стакгольм, Швецыя). Дзень 2-і.
**19.00** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. (Стакгольм, Швецыя). Дзень 1-ы.
**20.25, 00.55** Навіны.
**21.45** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Германія - Эквадор (Мексіка).
**01.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Бразілія - Данія (Мексіка).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**07.40** «Час гонару», серыял: 34 серыя.
**08.25, 14.30, 18.15** Чаму дэмакратыя? 3 серыя, «Таксі ў цемру».
**09.20** Прыватная калекцыя.
**09.40, 15.25** На колах.
**10.05, 15.55** Без рэтушы: «Кітайцы атакуюць», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**10.30** МакраФон: «Канцэрт гурта «N.R.M.»: ч. 2.
**11.30** «Ліст з Малдовы», дак. фільм, 2009 г., Румынія.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Маўчанне Лорны», маст. фільм, 2008 г., Германія–Францыя–Італія–Бельгія.
**13.45** «Час гонару», серыял: 34 серыя.
**16.15** Вагон.
**16.25** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.30** Эксперт.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 11 серыя.
**17.30** «Час гонару», серыял: 34 серыя.
**19.10** Побач з намі.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Беларусы ў Польшчы.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.30** Эксперт.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**21.40** «Маўчанне Лорны», маст. фільм, 2008 г., Германія–Францыя–Італія–Бельгія.
**23.25** Аб'ектыў.

## 21 ЧЭРВЕНЯ, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 22.45** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.15, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** «Камандзіроўка».
**12.10** «Настаўнік музыкі». Меладрама.
**13.50** «Ведай нашых».
**14.00** «Здароўе».
**14.25** «Культурныя людзі». Інфармацыйна-забаўляльная праграма.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага».
**16.05** Серыял «Дыхай са мной». Закл. серыя.
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 23.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** «Падполле супраць Абвера». Мастацка-публіцыстычны фільм (Беларусь). 3-я і 4-я, заключная, серыі.
**23.00** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**23.55** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 19.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Участак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Серафіма Цудоўная». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Крэпасць». Шматсерыйны фільм.
**23.10** АНТ прадстаўляе: «Музычныя вечары ў Мірскім замку».
**00.35** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Тата». Расія, 2004 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Гнюс». Францыя - Італія, 1971 г.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі 2». Серыял.
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла 2». Серыял.
**00.00** «Меч». Серыял.

### ЛАД

**07.00** «ЛАДная раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Рэальны свет.
**09.30** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**10.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**11.05** Камедыя «Знаёмства з Маркам».
**12.35** Баявік «Маёр Вятроў» (Беларусь-Расія). 3-я і 4-я, заключная, серыі.
**14.25** Прэм'ера. «Мяжа, што палае». Дакументальны фільм (Беларусь).
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.50** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Ноч напярэдадні». Дак. фільм.
**19.30** Баявік «Паміж жыццём і смерцю».
**21.05** Калыханка.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Тэлебарометр.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.30** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.35** Бітва экстрасэнсаў.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Адзін у полі ваяр. Подзвіг 41-га». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.50** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**22.15** Тэлесерыял «Правілы згону».
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** «Весткі.ru».
**23.40** «Яны загінулі за Францыю». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.10** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейныя».
**21.25** Вострасюжэтны серыял «Лютасць».
**23.35** «Нтвшнікі».
**00.30** «Увага: вышук!».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Германія - Эквадор (Мексіка).
**11.00, 18.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Бразілія - Данія (Мексіка).
**12.30, 19.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Буркіна Фасо - Панама (Мексіка).
**14.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Аўстралія - Кот-д'Івуар (Мексіка).
**15.00** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня. Часопіс.
**15.30** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы (Швецыя). Дзень 1-ы.
**16.45** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. (Стакгольм, Швецыя). Дзень 2-і.
**20.25, 01.25** Навіны.
**20.30** Бокс. ЗША.
**23.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. КНДР - Нідэрланды (Мексіка).
**01.00** Аўтаспорт. Часопіс.
**01.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Агляд.
**02.00** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.40, 12.55** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 11 серыя.
**08.05** «Маўчанне Лорны», маст. фільм, 2008 г., Германія–Францыя–Італія–Бельгія.
**09.50, 15.50** Еўропа сёння.
**10.15** Побач з намі.
**10.35** «Ранча», серыял: 10 серыя.
**11.25** Эксперт.
**11.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Чаму дэмакратыя? 3 серыя, «Таксі ў цемру».
**13.25** «Панна Ніхто», маст. фільм, 1996 г., Польшча.
**15.05** «Minsk-Mixt–2008»: Канцэрт гурта «Джамбібум».
**15.35** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**16.20** Побач з намі.
**16.35** Беларусы ў Польшчы.
**16.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 12 серыя.
**17.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 42 серыя.
**18.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Парад пераможцаў», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**20.10** Праект «Будучыня».
**20.40** Паляванне на дзівосы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Асабісты капітал.
**21.40** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча: ч. 1.
**22.20** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 11 серыя.
**23.05** «Васіль Быкаў. Вяртанне», дак. фільм, 2004 г., Беларусь.
**23.30** Аб'ектыў.

## 22 ЧЭРВЕНЯ, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтэрасаў».
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Відэафільм «Суцэльнасць слонімскай душы» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** «Яго батальён». Ваенная драма («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**14.25** Дак. фільм «Я чуў, як зямля енчыла…».
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**15.50** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**16.35** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**17.25** Зямельнае пытанне.
**17.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**18.15** Відэафільм АТН «Суражскія вароты».
**18.45** Драма «Брэсцкая крэпасць».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Цырымонія адкрыцця скульптурнай кампазіцыі. Прамая трансляцыя.
**22.15** «Мы жывыя памяццю». Канцэрт-рэквіем. Прамая трансляцыя.
**00.05** «Брэсцкая крэпасць». Хранікальна-дакументальны фільм (Беларусь).
**01.30** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.10** АНТ прадстаўляе: «Уварванне».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Участак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Серафіма Цудоўная». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Крэпасць». Шматсерыйны фільм.
**23.10** АНТ прадстаўляе: «Музычныя вечары ў Мірскім замку».
**00.45** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Даішнікі 2». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.30** «Забойная сіла 2». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі 2». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла 2». Серыял.
**00.00** «Меч». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Гала-канцэрт тэлевізійнага фэсту вайсковай песні «Зорка».
**10.40** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**11.25** Кінааповесць «Дачка камандзіра».
**12.40** Дак. фільм «Іван і Валянціна» (НГТРК).
**13.15** Канцэрт «Ад Масквы да Брэста…».
**14.40** «Брэсцкая крэпасць». Дак. фільм.
**15.35** Пазакласная гадзіна.
**15.50** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.50** Медычныя таямніцы.
**17.30** Медычныя таямніцы +.
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** «І вечны будзе май». Дак. фільм.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**00.00** «Час футболу. Чэмпіянат Еўропы U-21».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** Прэм'ера. «Першыя чатыры гадзіны». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**22.15** Тэлесерыял «Правілы згону».
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** «Весткі.ru».
**23.40** Прэм'ера. «Дырэктыва № 1. Вайна». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.10** Сёння.
**10.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.15** «Вар'яцкі дзень».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.25** Вострасюжэтны серыял «Лютасць».
**23.35** «Хто «прашляпіў» пачатак вайны». Дакументальны фільм.

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Агляд.
**10.00** Аўтаспорт. Часопіс.
**10.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Японія - Францыя (Мексіка).
**12.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Мексіка - Конга (Мексіка).
**13.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Ямайка - Аргентына (Мексіка).
**14.30** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. (Швецыя). Дзень 2-і.
**16.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Японія - Францыя (Мексіка).
**17.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Мексіка - Конга (Мексіка).
**18.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Ямайка - Аргентына (Мексіка).
**19.00** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. (Швецыя). Дзень 2-і.
**20.30** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**20.55** Навіны.
**21.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Мексіка - Конга (Мексіка).
**22.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Ямайка - Аргентына (Мексіка).
**23.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. ЗША - Узбекістан (Мексіка).
**00.55** Навіны.
**01.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Уругвай - Руанда (Мексіка).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20, 12.55** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 12 серыя.
**07.50, 13.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 42 серыя.
**08.45** Асабісты капітал.
**09.05** Праект «Будучыня».
**09.30, 15.10** Блізкая гісторыя. Іншы пагляд: «Парад пераможцаў», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**10.25** «Ранча», серыял: 11 серыя.
**11.15, 21.40** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча: ч. 1.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Невядомы і блізкі. Каталіцкі касцёл у Беларусі», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**14.20** Праект «Будучыня».
**14.45** «Васіль Быкаў. Вяртанне», дак. фільм, 2004 г., Беларусь.
**16.05** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.10** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 17 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 13 серыя.
**17.30** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 11 серыя.
**18.15** «Васіль Быкаў. Апошнія дні», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Героі не нашага часу Зінаіда Ярашэвіч. Загадчыца жыцця.
**20.00** На колах.
**20.30** Басанож па свеце.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Побач з намі.
**22.20** «Дэкалог, дзесяць», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**23.20** «Euromaxx».
**23.45** Аб'ектыў.

## 23 ЧЭРВЕНЯ, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** «Цубанікі». Кінанавэла.
**09.55** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.45** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.35** Відэафільм АТН «Шэпт столінскай багны» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** «Сваты-2». Серыял. 1-я серыя.
**13.15** «Сабака Баскервіляў». Невядомая версія». Дакументальны фільм (Украіна).
**14.00** Шэф-кухар.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага».
**16.05** Дэтэктыўны серыял « Апошняя рэпрадукцыя « (Расія).1-я серыя.
**17.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 00.55** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**21.55** «Сваты-2». Серыял. 1-я серыя.
**23.20** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**00.10** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**01.00** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Участак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Серафіма Цудоўная». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Крэпасць». Шматсерыйны фільм.
**23.10** АНТ прадстаўляе: «Музычныя вечары ў Мірскім замку».
**00.45** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Даішнікі 2». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.30** «Забойная сіла 2». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі 2». Серыял. Закл. серыя.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла 2». Серыял.
**00.00** «Меч». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** «Рэальны свет».
**09.40** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**10.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**11.05** Дача здароўя.
**11.40** Жансавет.
**12.15** «Лабірынты: Эдвард Вайніловіч».
**12.50** «Дывертысмент перамогі». Дакументальны фільм (НГТРК).
**13.15** Прыгодніцкі фільм «Корцік» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
**14.30** «І вечны будзе май». Дак. фільм.
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.15** Камедыя «Выхадкі ў каледжы» (ЗША).
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Матч кваліфікацыйнага раўнда.
**23.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**00.00** Бітва экстрасэнсаў.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Два жыцця Аляксандра Галіча». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**22.15** Тэлесерыял «Правілы згону».
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** «Весткі.ru».
**23.40** «Паядынак».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.10** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.30** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Асабліва небяспечны!».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.25** Вострасюжэтны серыял «Лютасць».
**23.35** Прэм'ера. «Сталін супраць Чырвонай арміі».
**00.25** «Вочная стаўка».

### EUROSPORT

**09.30** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня.
**10.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. ЗША - Узбекістан (Мексіка).
**11.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Уругвай - Руанда (Мексіка).
**12.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Канада - Англія (Мексіка).
**14.00, 19.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Чэхія - Новая Зеландыя.
**15.00, 16.00, 21.00, 22.00** Футбол. Залаты кубак. 1/2 фіналу. ЗША.
**17.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. ЗША - Узбекістан (Мексіка).
**18.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Канада - Англія (Мексіка).
**20.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Канада - Англія (Мексіка).
**20.55, 00.55** Навіны.
**23.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Буркіна Фасо - Германія.
**01.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Аўстралія - Бразілія (Мексіка).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**07.50** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**08.35** Сальда (эканамічная праграма).
**08.50** На колах.
**09.15** Героі не нашага часу Зінаіда Ярашэвіч. Загадчыца жыцця.
**09.35** «Васіль Быкаў. Апошнія дні», дак. фільм, 2008 г., Беларусь: ч. 1.
**10.00** «Васіль Быкаў. Апошнія дні», дак. фільм, 2008 г., Беларусь: ч. 2.
**10.25** «Ранча», серыял: 12 серыя.
**11.15** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча: ч. 2.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 17 серыя.
**12.50** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**13.15** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**14.00** Побач з намі.
**14.20** На колах.
**14.45** Басанож па свеце.
**15.10** Героі не нашага часу Зінаіда Ярашэвіч. Загадчыца жыцця.
**15.30** «Васіль Быкаў. Апошнія дні», дак. фільм, 2008 г., Беларусь: ч. 1.
**15.55** «Васіль Быкаў. Апошнія дні», дак. фільм, 2008 г., Беларусь: ч. 2.
**16.15** Вагон.
**16.30** «Euromaxx».
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял: 3 серыя.
**17.35** «Дэкалог, дзесяць», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**18.35** «Падзенне жалезнай заслоны», дак. фільм, 2009 г., Германія: 2 серыя, «Абвінаваўца Чаўшэску».
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Навігатар.
**20.00** «Euromaxx».
**20.25** Два на два (тэледыскусія): Юрась Губарэвіч і Віктар Івашкевіч.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**21.40** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча: ч. 3.
**22.25** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 11 серыя.
**23.15** Рэпартэр.
**23.45** МакраФон: «Рок-карона–2008»: ч. 2.
**00.15** Аб'ектыў.

## 24 ЧЭРВЕНЯ, ПЯТНІЦА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 22.50** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** «Сваты-2». Камедыйны серыял (Украіна). 2-я серыя.
**13.15** «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана. Знаёмства». Невядомая версія». Дакументальны фільм (Украіна).
**14.15** «Сінематэка».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага».
**16.05** Дэтэктыўны серыял « Апошняя рэпрадукцыя « (Расія).2-я серыя.
**17.00** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.00** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** «Сваты-2». Камедыйны серыял (Украіна). 2-я серыя.
**23.15** Фантастычны трылер «Ад заходу да світанку» (ЗША).
**00.50** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**01.20** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Участак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Камедыя «Няўдачлівыя».
**22.40** АНТ прадстаўляе: «Музычныя вечары ў Мірскім замку».
**00.20** Фільм «Кніга Ілая».
**02.15** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.45, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Даішнікі 2». Серыял. Закл. серыя.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next 2». Серыял. Закл. серыя.
**15.30** «Забойная сіла 2». Серыял.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**19.00** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «Дынама» (Мінск) - «БАТЭ» (Барысаў). Прамая трансляцыя.
**20.00** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «Дынама» (Мінск) - «БАТЭ» (Барысаў). Прамая трансляцыя.
**20.50** «КВЗ. Першая ліга. 1/4 фіналу».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.40** Фільм «Салдацкі дэкамерон». Расія, 2005 г.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Моладзевая камедыя «Выхадкі ў каледжы» (ЗША).
**10.55** Жывы гук.
**11.40** Кінаспробы.
**12.00** Гаспадар.
**12.25** Прыгодніцкі фільм «Корцік» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**13.45** «Цытадэль». Дакументальны фільм.
**14.15** Пазакласная гадзіна.
**14.40** Усё аб бяспецы.
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**18.00** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.20** Фантастычная камедыя «Знаёмцеся, Дэйв» (ЗША).
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Матч кваліфікацыйнага раўнда.
**23.05** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**23.50** «Пра мастацтва».
**00.20** Дыялогі аб рыбалцы.
**00.45** Бітва экстрасэнсаў.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. «Крывое люстэрка. Тэатр Яўгенія Петрасяна».
**22.25** Фільм «Усё не выпадкова».
**00.00** Навіны - Беларусь.
**00.10** Фільм «Святло ў канцы тунэлю».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.00** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Асабліва небяспечны!».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцэйны».
**21.25** «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**22.55** «Песня для вашага століка».
**00.05** Прэм'ера. Трылер «Доказ смерці».

### EUROSPORT

**09.30, 10.30, 18.00** Футбол. Залаты кубак. 1/2 фіналу. ЗША.
**11.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Буркіна Фасо - Германія (Мексіка).
**12.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Панама - Эквадор (Мексіка).
**14.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Кот-д'Івуар - Данія (Мексіка).
**15.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Аўстралія - Бразілія (Мексіка).
**16.45** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Панама - Эквадор (Мексіка).
**19.00** Футбол. Залаты кубак. 1/2 фіналу. ЗША.
**20.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Буркіна Фасо - Германія (Мексіка).
**20.55** Навіны.
**21.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Сербія.
**22.00** Боўлінг. Тур РВА. ЗША. Часопіс.
**23.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Японія - Аргентына (Мексіка).
**01.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. (Іпр, Бельгія). Дзень 1-ы.
**01.25** Навіны.
**01.30** Кіберспорт. Турнір Intel Extreme Masters. Агляд.
**02.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Ямайка - Францыя (Мексіка).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Чароўнае дрэва», серыял: 3 серыя.
**07.50** «Гняздо», серыял: 4 серыя.
**08.40** Навігатар.
**08.55** «Euromaxx».
**09.25** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 11 серыя.
**10.15** «Падзенне жалезнай заслоны», дак. фільм, 2009 г., Германія: 2 серыя, «Абвінавачца Чаўшэску».
**11.10** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча: ч. 3.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Дэкалог, дзесяць», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**13.00** «Чароўнае дрэва», серыял: 3 серыя.
**13.30** «Гняздо», серыял: 4 серыя.
**14.20** «Euromaxx».
**14.45** Два на два (тэледыскусія): Юрась Губарэвіч і Віктар Івашкевіч.
**15.15** Навігатар.
**15.30** «Падзенне жалезнай заслоны», дак. фільм, 2009 г., Германія: 2 серыя, «Абвінавачца Чаўшэску».
**16.25** Рэпартэр.
**16.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял: 3 серыя.
**17.30** Беларускія лёсы: «Алег Бябенін: Я застануся», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**17.50** Форум (ток-шоу): «Дырэктыва №4».
**18.30** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.35** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 11 серыя.
**19.30** Аб'ектыў.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.55** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.35** Аўтастопам праз Еўропу.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г., Францыя: 2 серыя, «Гаіці».
**22.15** «Пітбуль», серыял: 15 серыя.
**23.00** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.10** Аб'ектыў.

## 25 ЧЭРВЕНЯ, СУБОТА

---

**07.00** Мультфільмы.
**07.25** Існасць.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** «Шэф-кухар».
**10.50** Меладраме «Разумніца, прыгажуня» (Расія). 3-я серыя.
**12.10** «Вайна пад дахамі». Ваенная драма.
**13.55** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**14.20** «Час Саюза». Грамадска-палітычнае ток-шоў.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.20** Nota Bene.
**16.45** Дак. цыкл «Атлас «Дыскаверы» (ЗША).
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.30** «Месца сустрэчы». Музычна-забаўляльная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Фінал. Прамая трансляцыя.
**23.55** Канцэрт «Залаты грамафон» (2009).

---

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** «Смак жыцця».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**12.55** «Хадзячы замак». Анімацыйны фільм.
**15.15** Тэорыя неверагоднасці.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Геніі і злыдні».
**16.50** Фільм «Звычайны шпацыр у парку».
**18.25** АНТ прадстаўляе: «Музычныя вечары ў Мірскім замку».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.10** «Што? Дзе? Калі?» Фінал.
**23.20** Прэм'ера. «Перамір'е».

---

**07.00** Мультыплікацыйны фільм.
**07.30** «Анфас».
**07.45** Фільм «Парыжскія таямніцы». Францыя - Італія, 1962 г.
**09.35** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.05** Фільм «Кур'ер». СССР, 1986 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Прабачэнне». Расія - Украіна.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.25** Фільм «Джон Ф. Кэнэдзі: стрэлы ў Даласе». ЗША - Францыя, 1991 г.
**01.00** Фільм «Адпачынак без канца». ЗША, 1980 г.

---

**06.55** «Душэўныя боепрыпасы». Дакументальны фільм (НГТРК).
**07.25** Фантастычная камедыя «Знаёмцеся, Дэйв» (ЗША).
**09.05** Нашы тэсты.
**09.40** Усё аб бяспецы.
**10.10** Рэальны свет.
**10.50** Тэлебарометр.
**10.55** Дыялогі аб рыбалцы.
**11.25** Жансавет.
**12.00** Дача здароўя.
**12.40** «Страсці па культуры».
**13.20** Лабірынты старажытнай Таўрыды Арсенія Маркевіча.
**13.50** Серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**14.45** Рамантычная камедыя «Запрасі мяне дадому» (Канада).
**17.05** Меладрама «Хелен» (ЗША-Вялікабрытанія-Канада).
**19.10** Прэм'ера. Моладзевы музычны фільм «Вулічныя танцы» (Вялікабрытанія).
**20.55** Тэлебарометр.
**21.00** КЕНО.
**21.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**21.20** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Матч кваліфікацыйнага раўнда. Прамая трансляцыя.
**23.05** Жывы гук.
**23.45** «Час футболу. Чэмпіянат Еўропы U-21».
**00.25** Валейбол. Еўраліга. Мужчыны. Беларусь - Турцыя.

### РОССИЯ

**07.00** Фільм «Ключы ад раю».
**08.45** «Крывое люстэрка. Тэатр Яўгенія Петрасяна».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Усё не выпадкова».
**13.20** Мультфільмы.
**13.45** «Уся Расія».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.15** «Улада факту».
**16.00** Прэм'ера. «Вялікая сям'я».
**17.35** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Фільм «Несамотныя».
**00.05** «Дзяўчаты».

### НТВ

**07.30** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Агляд».
**08.50** «Медыцынскія таямніцы».
**09.25** «Жывуць жа людзі!».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Суд прысяжных».
**14.15** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**16.20** «Развод па-руску».
**17.10** «Вочная стаўка».
**18.05** «Выратавальнікі».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.25** «Прафесія-рэпарцёр».
**19.55** «Праграма Максімум».
**21.00** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**21.55** «Ты не паверыш!».
**22.50** «Апошняе слова». Ток-шоў.
**23.50** Фантастычны баявік «Вавілон нашай эры».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**10.15** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. КНДР - Конга (Мексіка).
**11.45** Аўтаспорт. Кубак свету Паршэ.
**13.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Мексіка - Новая Зеландыя (Мексіка).
**14.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Японія - Аргентына (Мексіка).
**15.15** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. КНДР - Конга (Мексіка).
**16.30** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Часопіс.
**17.00** Плаванне (Францыя). Дзень 1-ы.
**19.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Мексіка - Новая Зеландыя (Мексіка).
**20.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. КНДР - Конга (Мексіка).
**21.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Часопіс.
**21.30** Конны спорт. Турнір Global Champions Tour. Манака.
**23.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Уругвай - Англія (Мексіка).
**01.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. (Іпр, Бельгія). Дзень 2-і.
**01.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20, 12.00** «Машына зменаў», тэлесерыял: 3 серыя.
**07.50** Калыханка для самых маленькіх.
**08.30** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 11 серыя.
**09.20** Праект «Будучыня».
**09.50** «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г., Францыя: 2 серыя, «Гаіці».
**10.45** МакраФон: «Рок-карона–2008»: ч. 2.
**11.15** Аўтастопам праз Еўропу.
**11.35** Беларускія лёсы: «Алег Бябенін: Я застануся», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**12.25** Калыханка для самых маленькіх.
**13.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**13.15** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 11 серыя.
**14.05** Праект «Будучыня».
**14.35** Форум (ток-шоу): «Дырэктыва №4».
**15.15** «Бульбаны», мультсерыял.
**15.25** «Спадар Піліпенка і ягоны падводны човен», дак. фільм, Германія–Францыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 18 серыя.
**17.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**18.00** «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г., Францыя: 2 серыя, «Гаіці».
**18.50** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**19.15** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.25** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Англійская для дзяцей.
**19.50** Госць «Белсату».
**20.05** Еўропа сёння.
**20.30** Рэпартэр.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Беларускія лёсы: «Афганец», дак. фільм, 2009 г.
**21.40** Суботні сеанс: «Апошні імператар», маст. фільм, 1987 г., Брытанія–Кітай–Гон-Конг.
**00.15** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 4 серыя.
**01.00** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.
**01.10** Аб'ектыў.

## 16 ЧЭРВЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**06.05** Канцэрт «Залаты грамафон» (2009).
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**10.25** «Культурныя людзі».
**10.55** Меладрама «Разумніца, прыгажуня» (Расія). 4-я, заключная, серыя.
**12.10** «Сыны сыходзяць у бой». Ваенная драма («Беларусьфільм»).
**13.50** Сінематэка.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Ведай нашых».
**15.50** Фільм -фэнтэзі «Незвычайныя прыгоды Адэль» (ЗША).
**17.35** Канцэрт.
**18.05** Суперлато.
**19.20** OFF STAGE LIFE.
**19.35** Камедыі «Доктар Дулітл» (ЗША).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Гангстэрская сага «Аднойчы ў Амерыцы» (ЗША-Італія).

### Н

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.15** Фазэнда.
**11.50** «Праўдзівая гісторыя Чырвонага капялюшыка». Анімацыйны фільм.
**13.10** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Меладрама «Прынцэса спецый».
**18.05** АНТ прадстаўляе: «Музычныя вечары ў Мірскім замку».
**20.00** Контуры.
**21.05** Фільм «Лёгкія паводзіны».
**22.50** Фільм «Унутраная імперыя».

### СТВ

**05.35** Фільм «Джон Ф. Кэнэдзі: стрэлы ў Даласе». ЗША - Францыя, 1991 г.
**09.00** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Адвочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.35** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.25** «Добры дзень, доктар!».
**14.00** Фільм «Я крочу па Маскве». 1963 г.
**15.35** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.25** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Цудоўная Марта». Германія - Італія - Швейцарыя - Аўстрыя, 2001 г.
**22.35** «Прафесійны бокс».
**23.40** Фільм «Больш дзіўна, чым у раі». ЗША - Германія, 1984 г.

### Лад

**07.15** «Апошні ліст». Дак. фільм (НГТРК).
**07.40** Дабравест.
**08.05** Мір вашай хаце.
**08.20** Рамантычная камедыя «Запрасі мяне дадому» (Канада).
**10.25** Медычныя таямніцы.
**11.05** Медычныя таямніцы +.
**11.25** Тэлебарометр.
**11.30** Нашы тэсты.
**12.05** Кінаспробы.
**12.25** «Правы чалавека».
**12.40** Фільм «Леў» (Францыя).
**14.40** Серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**16.20** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Матч кваліфікацыйнага раўнда. Прамая трансляцыя.
**18.10** Баявік «Тэрмінатар 2: Судны дзень» (ЗША).
**20.30** «Навіны надвор'я».
**21.00** «Спортлато 5 з 36».
**21.05** КЕНО.
**21.10** Смешная часіна.
**21.40** Трылер «Час забіваць» (ЗША).
**00.10** Валейбол. Еўраліга. Жанчыны. Беларусь - Турцыя.

### РОССИЯ

**07.00** «Уся Расія».
**07.15** Мультфільмы.
**07.45** Фільм «Несамотныя».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «З новай хатай!».
**12.30** Фільм «Мая вуліца».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.45** «Апошні званок Нестара Пятровіча». Дакументальны фільм.
**16.35** «Песня не развітваецца..».
**18.35** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца».  Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «Толькі каханне». 2011 г.
**22.45** «Адмысловы карэспандэнт».

### НТВ

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Баль на ўвесь свет».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Суд прысяжных».
**14.15** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Гісторыя ўсерасійскага змяну».
**17.15** «І зноў добры дзень!».
**18.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**19.55** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**20.30** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**21.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны фільм «Лекара выклікалі?».
**23.20** «Гульня».
**00.15** «Асабліва небяспечны!».
**00.50** «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Ралійная серыя IRC. (Іпр, Бельгія). Дзень 2-і.
**10.00** Аўтаспорт. Серыя Гран-пры. (Валенсія, Іспанія). Гонка 1-я.
**10.30** Аўтаспорт. Серыя Гран-пры. (Валенсія, Іспанія). Гонка 2-я.
**11.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Канада - Руанда (Мексіка).
**12.15** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. ЗША - Новая Зеландыя (Мексіка).
**13.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Узбекістан - Чэхія (Мексіка).
**14.30** Футбол. Залаты кубак. ЗША. Фінал.
**15.30** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Часопіс.
**16.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Нігерыя - Францыя (Германія).
**18.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Уругвай - Англія (Мексіка).
**19.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Германія - Канада (Германія).
**21.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Часопіс.
**21.15** Плаванне. Парыж, Францыя. Дзень 2-і.
**22.15** Мотаспартыўны часопіс.
**22.30** Ралі. Ралійная серыя IRC. (Іпр, Бельгія). Агляд.
**23.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Групавы этап. Панама - Германія (Мексіка).
**01.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Германія - Канада (Германія).
**02.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Часопіс.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 18 серыя.
**08.00** Калыханка для самых маленькіх.
**08.30** Рэпартэр.
**08.55** Еўропа сёння.
**09.25** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 4 серыя.
**10.10** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.35** Беларускія лёсы: «Афганец», дак. фільм, 2009 г.
**11.00** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.10** Госць «Белсату».
**11.25** «Апошні імператар», маст. фільм, 1987 г., Брытанія–Кітай–Гон-Конг.
**14.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 18 серыя.
**14.50** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**15.15** «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г., Францыя: 2 серыя, «Гаіці».
**16.10** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**16.35** Беларускія лёсы: «Афганец», дак. фільм, 2009 г.
**17.00** Прыватная калекцыя.
**17.20** «Час гонару», серыял: 35 серыя.
**18.05** Чаму дэмакратыя? 4 серыя, «У пошуках Ґандзі».
**18.55** Басанож па свеце.
**19.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Англійская для дзяцей.
**19.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.55** На колах.
**20.20** Вагон.
**20.30** Без рэтушы: «Беларускі лес», дак. фільм.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт.
**21.55** Фільматэка майстроў: «Прынцэсы», маст. фільм, 2005 г., Іспанія.
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.55** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, афоміўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей;
(8 029) 178 31 68, Вольга;
Бабруйск: (8029) 628 75 01, Вольга

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
www.novychas.org

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня

Кассир Всего

КІНО

# ЛІНКАЛЬН І ВАМПІРЫ

Алег НОВІКАЎ

**У Галівудзе пачаліся здымкі фільма, выхад на экраны якога можа выклікаць працэс перагляду ў масавай свядомасці цяперашняга разумення гісторыі.**



Сюжэт карціны пабудаваны на кнізе Сета Грама-Сміта «Абрахам Лінкальн паляўнічы за вампірамі». Кніга ўяўляе буйны палёт фантазіі.

Адпаведна аўтару, ён атрымаў тэкст кнігі ад вампіра Генры Стэрджэса. Тэкст — гэта дзённікі 11-га прэзідэнта ЗША Абрахама Лінкальна.

Калі Лінкальну было 11 гадоў, яго бацька Томас прызнаўся яму, што вампіры — гэта істоты, якія сапраўды існуюць. Больш таго, быццам вампіры нават пакусалі дзеда Абрахама, які ў сваю чаргу спрабаваў пакусаць ягоную маці. Лінкальн дае клятву забіць як мага больш вампіраў.

У 16 гадоў Лінкальн знаёміцца з вампірам Генры Стэрджэсам, які выратоўвае яму жыццё і пасля вучыць некаторым дэталям прыроды вампіраў. Абрахаму становіцца вядома, што існуюць і кепскія, і добрыя вампіры, як Генры. У дадатак хлопец праходзіць своеасаблівы курс маладога байца. Нарэшце, Лінкальн атрымлівае ад свайго апекуна, як бы сказалі сёння, адрасную базу злых вампіраў ЗША. Ён пачынае зачыстку краіны ад нечысці.

Пасля пачынаецца ўвогуле суцэльны жах. Лінкальн падарожнічае на параходзе па Місісіпі ў Новы Арлеан, дзе становіцца сведкам сцэны гандлю рабамі. Нейкі гандляр паводзіць сябе настолькі брутальна, што Абрахам вырашае пакараць яго за здзекі з чарнаскурых. Лінкальн адсочвае гандляра. Аказваецца, той не проста садыст, а яшчэ і вампір. Бедным чарнаскурым даводзіцца не толькі працаваць у нечалавечых умовах, аднак і задавальняць патрэбу гаспадара ў крыві. Лінкальн дае прыкурыць таму эксплуататару. Адначасова Абрахаму ў галаву прыходзіць думка: рабства з'яўляецца крыніцай вампірызму. Вампірызм будзе існаваць у Злучаных Штатах, пакуль будуць існаваць рабы. Так Лінкальн стаў абаліцыяністам і вырашыў падацца ў палітыку, каб пакласці канец рабству.

Ён вяртаецца ў родны Нью-Салем, дзе займаецца бізнэсам і робіць першыя крокі ў палітыцы. Аднак гэта ўдзень. Уначы ён ганяецца за вампірамі з таго самага спісу Генры. Пасля абрання ў Палату Прадстаўнікоў Абрахам пераязджае ў Вашынгтон, дзе сустракаецца з вядомым пісьменнікам Эдгарам По. Эдгар распавядае дэпутату сакрэтныя планы вампіраў. Па яго словах, яны масава бягуць з Еўропы ў Штаты, дзе існаванне рабства вырашае праблему выжывання. Аднак гэтага крывапійцам замала. Яны плануюць зрабіць рабамі не толькі чорных, аднак і белых. Гэтая споведзь каштуе літаратару жыцця. Хутка По знаходзяць мёртвым у Балтымары: яго забіла шайка вампіраў.




На гэты час Лінкальн адыходзіць ад прафесіі паляўнічага на вампіраў. Таксама ён вырашае пакінуць вялікую палітыку. Аднак яго планы мяняюцца, калі ў 1857 годзе да яго наведваецца Генры Стэрджэс з жудаснымі навінамі. Вампіры Поўдня рыхтуюцца да вайны з паўночнымі штатамі, каб цалкам падпарадкаваць сабе краіну і абвесціць нешта накшталт Злучаных Вампірскіх Штатаў Амерыкі. Абрахам Лінкальн разумее: трэба нешта рабіць. Ён становіцца кандыдатам у прэзідэнты ад Рэспубліканскай партыі і з часам абіраецца на пасаду кіраўніка Белага Дому.

У адказ паўднёвыя штаты ўздымаюць мяцеж. Войскі канфедэратаў (чытай вампіры) лёгка перамагаюць федэралаў. Натуральна, вайна для іх яшчэ магчымасць на халяву напіцца чужой крыві. Што рабіць? Лінкальну прыходзіць у галаву ідэя — пазбавіць паўднёвых вампіраў энергакрыніц. Ён выдае акт, які адмяняе рабства ў краіне. Адпаведна, чарнаскурыя масава бягуць ад эксплуататараў, якіх без дзяжурнай дозы крыві, кажучы наркаманскім слэнгам, жудасна кілбасіць.

Помста не прымушае сябе чакаць. Вампіры-канфедэраты дасылаюць у Вашынгтон свайго агента, які кусае 11-гадовага сына прэзідэнта. Ён паміраe на вачах бацькі. Усё той жа Генры Стэрджэс прапануе Лінкальну выйсце: ён укусіць яго сына, і той зможа жыць. Праўда, як вампір. Лінкальн настолькі раз'юшаны прапановай, што выганяе Генры і дае клятву ніколі больш не мець кантактаў нават з добрымі вампірамі.

Між тым, з Поўдня прыходзяць добрыя весткі: сепаратысты разбітыя. Апошнія вампіры эмігруюць у Азію і Лацінскую Амерыку, дзе засталіся рэшткі рабства. На радасцях прэзідэнт вырашае наведаць тэатральную пастаноўку, падчас якой артыст Джон Буз забівае яго (ці варта казаць, што Джон таксама быў вампірам). Вампіры святкуюць перамогу, аднак нечакана з'яўляецца той самы Генры Стэрджэс разам з паліцыяй. Усіх арыштоўваюць. Той жа Генры праводзіць Абрахама Лінкальна ў апошні шлях.

Наступныя кадры фільму — 1960-я гады. У Вашынгтоне масавая маніфестацыя ў падтрымку правоў чарнаскурых амерыканцаў. Марцін Лютэр Кінг кідае з трыбуны славутыя: «Я маю мару». Здалёк за ім назіраюць Генры Стэрджэс і... Лінкальн. Аказваецца, Генры паспеў укусіць Абрахама, калі той пасля стрэлаў Буза знаходзіўся ў стане агоніі. Лінкальн стаў вампірам, хаця і добрым. А вампіры, як вядома, не паміраюць.

Вось такі сінопсіс кнігі, якая адразу пасля выхаду выклікала супярэчлівыя рэцэнзіі. Газета «The Los Angeles Times» напісала: «Аўтар змог распавесці пра вялікую асобу з дапамогай гумару і жанру гісторый пра вампіраў». Затое часопіс «Time» палічыў, што Грэм-Сміт яўна перабраў, калі прадставіў рабства як вынік вампірызму. Іншы часопіс «Entertainment Weekly» назваў кнігу «трывіяльнай».

Аднак, думаецца, што пісьменніка мала цікавілі меркаванні літаратурных крытыкаў. Яго больш цікавіла тое, што «Лінкальн — паляўнічы за вампірамі» 15 тыдняў пратрымаўся ў спісе бестселераў аўтарытэтнага выдання «New York Times». Гэты факт гарантуе аўтару новыя заказы ад выдаўцоў і інтарэс з боку Галівуду. У выніку Галівуд хутка купіў правы на «Паляўнічага за вампірамі». Стужку будзе здымаць расіянін Цімур Бекмамбетаў. Папярэдняя дата прэм'еры — 22 чэрвеня 2012 года. Бюджэт карціны — 16 мільёнаў долараў.

Між тым, сур'ёзныя выданні ужо б'юць трывогу. Фільм можа пакласці пачатак цэламу жанру гістарычных фантазій. Магчыма, заўтра на экраны выйдзе стужка кшталту «Сталін — сябра гномаў. «Галівуд мяняе гісторыю сучаснасці, прыпісваючы гістарычным персанажам тое, што яны ніколі не рабілі. Гублюцца вечныя арыенціры зла і дабра», — абураецца «El Pais». У якасці своеасаблівага адказу на падобныя абвінавачванні вядомы рэжысёр Цім Бартан кажа: «Хочаце сапраўднай гісторыі? Глядзіце History Channel».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Лукашэнка заўсёды пазіцыянаваў сябе ў якасці абаронцы беларускай незалежнасці. Вяртанне пад уплыў былых каланіяльных гаспадароў з Масквы можа выклікаць моцную грамадскую незадаволенасць. Лічыцца, што беларусы пасіўныя і не цікавяцца палітыкай. Вялікая частка мясцовай апазіцыі сядзіць у турме ці жорстка кантралюецца. Але для ўсіх рана ці позна настае пераломны момант.

**«Global Post» (ЗША)**

Варта прызнаць, што ў беларусаў ёсць цалкам абгрунтаваныя падставы для незадаволенасці: краіна перажывае самы горшы ў сваёй найноўшай гісторыі эканамічны крызіс. Па меркаванні эканамістаў, папулісцкія рашэнні Аляксандра Лукашэнкі і яго нежаданне рэфармаваць зробленую па савецкім узоры і неэфектыўную беларускую эканоміку, дагэтуль на 80% кантраляваную дзяржавай, паставілі краіну на край прорвы. Пакуль прэзідэнту ўдавалася рабіць адказнымі за крызіс Расію, Захад і міністраў яго ўласнага ўрада. Аднак зараз, калі гнеў беларусаў урэшце абудзіцца, рэжым хоча гарантаваць, што сацыяльныя сеткі не паслужаць каталізатарам падзей, як у Тунісе і Егіпце.

**«La Croix» (Швейцарыя)**

Лукашэнку не пераробіш. Ён зноў паспрабуе знайсці спосаб, выконваючы дамоўленасці па форме, не выконваць іх па факце. Гэта ў якіх-небудзь краінах Захаду прыватызацыя, магчыма, праводзіцца адносна сумленна: той, хто атрымлівае кантрольны пакет акцый, здабывае і рэальны кантроль над прадпрыемствам. На расійскіх абшарах усё было не так. Барыс Беразоўскі, памятаецца, выкарыстоўваў для гэтага такі просты метад — купляў менеджмент прадпрыемстваў. А Аляксандру Рыгоравічу нават няма патрэбы кагосьці купляць. У яго руках усе галіны дзяржаўнай улады Беларусі. Ён можа імгненна законы памяняць, кагосьці пасадзіць, кагосьці прызначыць. І прывітанне вам, расійскія ўладальнікі беларускага кантрольнага пакета акцый! Калі Бацька пачне паводзіць сябе «не вельмі карэктна», супраць яго зноў ужывуць шокавую тэрапію. Але гэта ўжо наступны раўнд вялікай расійска-беларускай гульні. Гульні, якая ўсім надакучыла, але якая ўсё працягваецца і працягваецца.

**«Московский Комсомолец» (Расія)**

7 чэрвеня народнае абурэнне прыняло новы паварот у выніку росту кошту паліва на 30% на працягу адной ночы ўслед за 20-працэнтным ростам у маі і абмежаваннем продажу колькасці паліва на адзін аўтамабіль 25 літрамі. Лукашэнка запатрабаваў ад урада зменшыць кошты на бензін. У гэтага былога старшыні калгасу, прыхільніка планавай эканомікі, няма ніякага плану выйсця з крызісу. Дэвальвацыя, змена цэннікаў, чэргі ў абменных пунктах: пастунова краіна каціцца ў хаос.

**«Le Monde» (Францыя)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### КУБА. З ПРАВАМІ ЎСЁ ДОБРА

Кубінскі афіцыёз прыдумаў новую формулу, як адбіваць медыя-атакі наконт тэмы парушэння ў краіне правоў чалавека. У аснову пакладзеная тэма сэксуальных меншасцяў. Канкрэтная нагодай стала першая ў гісторыі аперацыя па змене пола, якую правялі кубінскія ўрачы. Увогуле, яны рабілі падобныя аперацыі і раней, аднак толькі за грошы багатым іншаземным турыстам. Цяпер пад скальпель лёг Хуан Сантас — 61-гадовы кубінец, які заўсёды марыў быць жанчынай. Зараз яго мара здзейснілася. Паралельна аперацыі ўся афіцыйная прэса перамывала косткі заходнім праваабаронцам, якія ўпарта ігнаруюць дасягненні Гаваны ў галіне абароны правоў сэксуальных меншасцяў. Так, напрыклад, толькі на Кубе і ў Аргенціне дзяржава гарантуе права кожнаму змяніць пол, прычым бясплатна. Статыстыка злачынстваў супраць гомасэксуалістаў на Кубе амаль ідэальная. За апошнія два гады быў забіты толькі адзін гей. Параўнайце — 260 забітых у Бразіліі або 171 — у маленькім Гандурасе. Нарэшце, Куба — адна з нешматлікіх краін Карыбскага мора, дзе гомасэксуалізм не лічыцца злачынствам. І пасля гэтага, пішуць кубінскія медыя, нехта яшчэ кажа пра тое, што на Кубе парушаюцца правы чалавека!

**Па матэрыялах ABC (Іспанія)**

### МАЛДОВА. МАЗЫ ПАЎПЛЫВАЛІ НА ВЫБАРЫ

У Малдове прайшоў першы тур мясцовых выбарах, перамогу на якіх атрымалі камуністы. Галоўным прарывам партыі Вароніна стаў Кішынёў, які чырвоныя страцілі яшчэ 20 гадоў таму. Цяпер варонінцы вяртаюцца ў сталічную ўладу. У партыі будзе 26 мандатаў у муніцыпальным савеце, які ўключае 51 чалавека. Акрамя таго, Дзмітры Дадон, кандыдат ад камуністаў, прайшоў у другі тур, дзе будзе спаборнічаць з цяперашнім мэрам Дарынам Кіртаакэ, які прадстаўляе правую ліберальную партыю. Сваім правалам у Кішынёве малдаўскія правыя абавязаныя ў тым ліку мінскаму заводу МАЗ. Вялікі рэзананс атрымала афера вакол набыцця кішынёўскім муніцыпалітэтам партыі МАЗаўскіх аўтобусаў. Калі машыны прыйшлі ў Малдову, аказалася, што большасць з іх не працуюць. Левая апазіцыя зрабіла з гэтай нагоды вялікую інфармацыйную кампанію супраць Кіртаакэ, абвінаваціўшы яго ў крадзяжы грошаў з бюджэту. На думку камуністаў, дамова з МАЗам была зробленая праз блізкія да клану мэра бізнэс-структуры. Самае смешнае, што камуністы, якія раней ідэалізавалі беларускую мадэль, цяпер крытыкуюць беларускую прадукцыю. А што рабіць — палітыка ёсць палітыка.

**Па матэрыялах «Пульс» (Малдова)**

### РАСІЯ. ЗАЛАТАЯ АРДА АДНАЎЛЯЕЦЦА

Калмыкію наведаў прэзідэнт Манголіі, што дало падставу казаць пра магчымы саюз калмыкаў і манголаў, якія належаць да адной этнічнай групы. Падчас сустрэчы з кіраўніком Калмыкіі Аляксеем Арловым мангольскі гарант заклікаў да стварэння восі Эліста — Улан-Батар. Праўда, пра палітыку гаворкі пакуль няма. Галоўныя акцэнты новай Залатой Арды (так празвалі саюз у прэсе) — эканоміка, адукацыя і культура. Так, студэнты з Калмыкіі будуць мець магчымасць праходзіць стажыроўку ў мангольскіх ВНУ. Асаблівае месца ў супрацоўніцтве адводзіцца шанаванню хана Убашы. Убашы — калмыцкі хан, лідар волжскіх калмыкаў, у 1771 годзе ўзначаліў уцёкі 169 тысяч калмыкаў з Расіі, з берагоў Волгі, на гістарычную радзіму — у падуладнае Кітаю Джунгарскае ханства. Ён з'яўляецца культавай фігурай і ў Манголіі, і ў Калмыкіі. У знак падзякі за тыя ўцёкі мангольскія бізнэсмэны на свае сродкі ўзвядуць на радзіме хана помнік.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

### ІНДЫЯ. ПАЧАЛАСЯ РЭВАЛЮЦЫЯ ЁГАЎ

5 чэрвеня індыйская паліцыя газам разагнала «прыхільнікаў гуру секты аматараў ёгі Свамі Рамдзева, які праводзіў у Нью-Дэлі галадоўку ў знак пратэсту супраць карупцыі. Сам галадаючы ледзь збег ад праваахоўных органаў. Гэты інцыдэнт даў падставу прэсе ўсур'ёз казаць пра пагрозу рэвалюцыі ёгаў. Гуру Свамі Рамдзеў — асоба вельмі папулярная ў цэнтральнай Індыі, яго паслядоўнікі лічаць яго святым і гатовыя рушыць услед любому яго закліку. Свамі ў свой час доўга і інтэнсіўна практыкаваў самадысцыпліну і медытацыю, пасля стварыў асабісты фонд, набраў паству прыхільнікаў (яго семінары наведваюць да 50 тысяч чалавек), і нарэшце вырашыў падацца ў палітыку. Ёг не мае ўласнай партыі, аднак яго рух выступае пад выразнымі нацыяналістычнымі лозунгамі. На думку спецыялістаў, у іншы час да заяў гуру паставіліся з усмешкай, аднак зараз Індыя перажывае ломку старой партыйнай сістэмы. Губляе папулярнасць кампартыя, і гэтую нішу імкліва займаюць рознага кшталту папулісты кшталту Свамі. У гэтым плане прагназуюць, што рух Свамі хутка зможа набраць палітычную вагу. Дарэчы, сам ён ужо абвясціў сябе новым Гандзі.

**Па матэрыялах «New York Times» ( ЗША)**



**КАНЦЭПЦЫЯ**

# БАТЫР — УСЯМУ АСНОВА

*Алег НОВІКАЎ*

**20-годдзе незалежнасці Казахстана пройдзе разам са святкаваннем іншай даты — 300 гадоў ад нараджэння батыра Абылая. Менавіта батыры сталі асновай канцэпцыі нацыянальнай гісторыі незалежнага Казахстану.**

«Батыр» перакладаецца з цюркскай мовы як «герой» (дарэчы, адсюль пайшло і рускае слова багатыр). Аднак на Усходзе практыка ўжывання слова больш шырокая: назва «батыр» або «багадур» была прыняты ў якасці царскага тытулу шматлікімі дынастыямі Усходу. Напрыклад, батырам называў сябе Бабур — заснавальнік Імперыі вялікіх манголаў. Пасля таго, як на пачатку XX стагоддзя на мапе свету з'явілася Манголія, батыр стаў мангольскім вайсковым чынам. За ваенныя заслугі гэты тытул быў прысвоены больш чым ста афіцэрам, у тым ліку вядомаму расійскаму беламу генералу Раману Фёдаравічу фон Унгерн-Штэрнбергу. Здаецца, апошнім, хто быў афіцыйна ўзнагароджаны тытулам «батыр», быў казах Аспан, адзін з заснавальнікаў Усходне-Туркестанскай Рэвалюцыйнай Рэспублікі. Цікава, што права Аспану называцца батырам дала Масква, пад патранатам якой знаходзіўся Усходні Туркменістан.

Між тым, у народзе «батырамі» традыцыйна называлі проста мужных людзей. Часам слова выкарыстоўвалася як дадатак да асабістага імя (напрыклад, Сухэ-Батар). Яшчэ адзін важны момант — «батыр» стаў персанажам казак і легенд. Фактычна ў часы СССР іх часцей так і ўспрымалі, як герояў фальклору.

Усё змянілася пасля абвяшчэння Казахстанам незалежнасці. Новая дзяржава сутыкнулася з праблемай стварння канцэпцыі нацыянальнай гісторыі. Па савецкіх падручніках дзяржаўныя структуры складваліся ў Казахстане паралельна расійскай каланіяльнай экспансіі XVIII–XIX стагоддзяў. Казахскае ханства (1479–1822) усур'ёз як дзяржава не разглядалася, паколькі, як правіла, яе адміністратыўныя органы качавалі па стэпу.

Тады ў асяроддзі афіцыйных гісторыкаў нарадзілася канцэпцыя Качавой цывілізацыі. Ключавая ідэя палягала ў тым, што да прыходу рускіх на казахскай тэрыторыі існавала добрая сацыяльная арганізацыя. Заставалася толькі знайсці яе артэфакты і напісаць яе гісторыю. Выйсце было знойдзена. «Качавая цывілізацыя як з'ява ў гісторыі існавала, толькі яе характарыстыкі выкладзены ў легендах. Трэба перавесці гэта на мову навукі», — сказаў адзін з афіцыйных казахскіх гісторыкаў.



Гісторыкі сталі актыўна заглыбляцца ў казкі і легенды, дзе галоўную ролю займаюць батыры. Так была заснаваная фабрыка батыраў. У шматлікіх гарадах можна пабачыць манументы героям мясцовага фальклору, якія, па словах уладаў, былі рэальнымі гістарычнымі персанажамі. Самі батыры нечакана набылі рысы сяброў нейкай вайсковай карпарацыі, чый этычны кодэкс падобны на кодэкс еўрапейскіх рыцараў. Узнік нават новы гістарычны тэрмін — «батырства».

Афіцыйная газета «*Казахстанская правда*» наступным чынам раскрывае яго сутнасць: «Батырства — гэта аснова старажытнай структуры грамадскай і дзяржаўнай арганізацыі казахаў. Батыры — адмысловая сацыяльная катэгорыя людзей, паходжанне сацыяльнага інстытута «батырства» найперш звязана з такімі асабістымі якасцямі чалавека, як доблесць, адвага. Батыр — не толькі тытул храбраца, але яшчэ ён таксама пазначае катэгорыю прафесійных вайскоўцаў. Таму шырокае існаванне слова «батыр» у казахскіх стэпах шмат у чым тлумачыцца вялікай значнасцю войнаў у гісторыі станаўлення казахскай дзяржаўнасці».

**Нурсултан Назарбаеў заяўляе, што не належыць да прадстаўнікоў казахскіх арыстакратычных фамілій. Ён з невялікага роду Шапрашты. Кажуць нават, што гэтая акалічнасць не дазваляе яму абвясціць Казахстан канстытуцыйнай манархіяй**

Як вядома, Нурсултан Назарбаеў заяўляе, што не належыць да прадстаўнікоў казахскіх арыстакратычных фамілій. Ён з невялікага роду Шапрашты. Кажуць нават, што гэтая акалічнасць не дазваляе яму абвясціць Казахстан канстытуцыйнай манархіяй. У такім разе значна больш правоў будуць мець нашчадкі Чынгізідаў — кіруючая дынастыя Казахскага ханства. Стварэнне «батырства» дазволіла б Назарбаеву часткова вырашыць праблему свайго паходжання.

У 1993 годзе Назарбаеў сказаў публічна, што Карасай батыр з'яўляецца яго восьмым продкам. Больш таго, па словах прэзідэнта, калі Карасай батыр і продак яго жонкі Сары Алпысаўны стаялі спіной адзін да аднаго, 500 ворагаў не маглі падыйсці да іх. Публіцы прадставілі кнігу «Пра далёкіх продкаў да маіх дзён», быццам напісаную ў XVIII стагоддзі пра подзвігі таго самага Карасая. У выніку шырокамаштабнай PR-акцыі (наклад кнігі склаў 300 тысяч экзэмпляраў) літаральна з нічога паўстала выява магутнага Карасай батыра, продка прэзідэнта Назарбаева. На высокім узгорку каля сяла Шамалган узнёсся да неба велізарны помнік Карасай батыру.

Той факт, што арыгінал рукапісу XVIII стагоддзя пра Карасая ніхто дасюль не бачыў, выклікае падазрэнні наконт таго, што Карасай сапраўды існаваў. Па ходу кампаніі ўлады сутыкнуліся з цікавай з'явай. Тыя батыры, якія ў адным раёне лічацца героямі нацыянальнага маштабу, для жыхароў суседняга раёна — усяго толькі канакрады.

Батырства даўно ўжо трапіла ў фокус крытыкі шматлікіх казахскіх гісторыкаў. Аднак комплекснай працы наконт гістарычных фальсіфікацый вакол батыраў пакуль няма. Магчыма, іх стрымлівае невясёлы досвед журналіста Ербола Курманбаева. Ён апублікаваў у газеце «Свабода слова» артыкул «Карасай батыр — казахскі Ілля Мурамец» і адразу атрымаў іск ад прадстаўнікоў роду Шапрашты за зневажанне гонару іхняга продку. Іск склаў 800 мільёнаў тэнге. Гэта рэкордны іск у казахскай гісторыі.

Гісторыкі маюць надзею, што «батырства» закончыцца само па сабе. «Мабыць, працэс з'яўлення новых батыраў раённага маштабу будзе ісці датуль, пакуль не будуць здаволены запатрабаванні ўсіх мясцовых абшчын у сваіх уласных героях», — адзначае казахскі гісторык Ірына Ерафеева. Яна таксама звяртае ўвагу на тое, што батырства не спрыяе нацыянальнаму адзінству. «На дзяржаўным узроўні карэкцыя гісторыі як папаўненне пантэона мясцовых батыраў не мае ідэалагічнай каштоўнасці, ды і папросту немагчымая», — кажа яна. Таксама не зразумела, як інтэграваць у «батырства» рускамоўных грамадзян Казахстану. У гэтым плане чуюцца заклікі да таго, каб шукаць адзіных гістарычных куміраў як для казахаў, так і для рускіх.

Аднак, калі папраўкі і будуць, то не ў гэтым годзе. Сёлета Казахстан паралельна 20-годдзю Незалежнасці будзе адзначаць 300-годдзе з дня нараджэння хана Абылая, аднаго з самых вядомых казахскіх батыраў.

ЦІКАВА

# ПАЛІТЫКА І ВЕРНАСЦЬ





Алег НОВІКАЎ

**Як павінна рэагаваць жонка палітыка на навіну пра тое, што яе муж ходзіць налева? Прыгоды Строс-Кана выклікалі цікавасць да паводзін жонак палітыкаў, якія даведаліся, што ім здрадзілі.**

Варыянт першы і, здавалася, самы правільны — паступіць, як зрабіла жонка Джыма МакГрывея, губернатара штату Нью-Джэрсі. Калі ён у 2003 годзе заявіў, што «з'яўляецца амерыканскім геем» і ў дадатак мае раман са сваім дарадцам па справах нацыянальнай бяспекі, жонка папросту падала на развод. Гэта быў сапраўдны ўдар для МакГрывея, які меў надзею, што жонка зразумее яго крок і будзе на яго баку. Разводны працэс значыў фінал палітычнай кар'еры Джыма. З-за крытыкі з боку грамадства ён быў вымушаны пайсці ў адстаўку з пасады губернатара. Зараз, калі верыць прэсе, ён намагаецца стаць каталіцкім біскупам, аднак Касцёл не вельмі гэтага жадае і ўвесь час адкладае канчатковае рашэнне.

Такім жа чынам паступіла Марыя Шрывер, жонка Арнольда Шварцэнэгэра, губернатара Каліфорніі. Як толькі яна даведалася пра тое, што яе муж мае 14-гадовую дачку ад нейкай служанкі, сабрала свае валізкі і сышла з дому. Пасля быў судовы іск пра разрыў шлюбу з Арнольдам, які, дарэчы, трываў цэлых 25 гадоў.

Аднак, як ні парадаксальна, такія выпадкі ў гісторыі адзінкавыя. Як сведчыць практыка, вельмі рэдка жонкі палітыкаў, якім здрадзілі, рашаюцца на такі ўчынак, як разрыў шлюбу.

Класічны выпадак — гісторыя адзюльтэра Біла Клінтана. Буйны скандал наконт адносін Біла і Монікі Левінскі, здавалася, павінен быў пахаваць шлюб. Аднак Хілары не пабегла ў суд. Наадварот, нават калі ўсім было зразумела, што Біл хлусіць, тая ўпарта рабіла выгляд, што верыць, нібыта яе муж не здольны круціць службовыя раманы з сакратаркамі.

Тое, што паводзіны Хілары — не нонсенс, сведчыць учынкі Эн Сінклер. Жонка Дамініка Строс-Кана, калі даведалася, што той загрымеў у турму за сэксуальныя дамаганні да пакаёўкі нью-ёркскага гатэлю, заявіла, што тут яўна мела месца нейкая змова. Пасля адправілася за акіян вызваляць другую палову. На гэтую справу, як пішуць газеты, яна ўжо выклала прыкладна паўтара мільёна долараў. Толькі на залог за вызваленне Дамініка пайшоў мільён. Пры гэтым яшчэ ніхто не ведае, у колькі абышліся ёй адвакаты. Не проста адвакаты, а адвакаты супер-класу. Дамініка будуць абараняць тыя самыя адвакаты, якія ў свой час давялі, што Майкл Джэксан не з'яўляецца педафілам.



Пры гэтым, думаецца, Эн сама ведае, што ніякай змовы супраць яе мужа няма. У яе мужа сэксуальныя дамаганні — проста норма. Так, у 2006-м папаўзлі чуткі, што ён завёў раман з нейкай венгеркай. На просьбу журналістаў гэта пракаментаваць, Эн, паціскаючы плячыма, адказала: «Кожны салідны палітык павінен валодаць мастацтвам спакушаць».

Паводзіны Сінклер цалкам адпавядаюць тыпу паводзін тых, хто заключыў шлюб тыпу *couple-power*. Партнёры ў такім шлюбе дамаўляюцца дапамагаць адзін аднаму рабіць кар'еру. Жонкі і мужа ў класічным разуменні ў такіх сем'ях няма. Адпаведна, кожны з партнёраў мае большую ступень сэксуальнай свабоды. Адпаведна, у сем'ях *couple-power* здраду мужа-палітыка разглядаюць не так драматычна. Хутчэй як нейкі непрыемны выпадак, форс-мажор, з якога проста не робяць вялікай драмы.

Жанчыны, якія абіраюць палітыкаў, робяць інвестыцыю ў сваю асабістую кар'еру. Тая ж Хілары лепшы прыклад. Дзякуючы ёй Біл пайшоў у палітыку, выйграў выбары губернатара Арканзасу, а пасля і прэзідэнта. Гэта адчыніла місіс Клінтан зялёнае святло ў калідоры ўлады. І зараз яна дзяржаўны сакратар, а яе муж грае на саксафоне і час ад часу чытае лекцыі ва ўніверсітэтах. Пара практычна не жыве разам.

Таму паводзіны Эн Сінклер цалкам зразумелыя. Аднак не факт, што яна зможа выстаяць да канца. На судзе з боку абвінавачвання будуць агучаныя шматлікія факты сэксуальных прыгод яе мужа, якія павінны сведчыць, што дамаганні да пакаёўкі цалкам пасуюць яго формуле жыцця. Шматлікія каментатары маюць сумнеў, што мадам Сінклер будзе здольная прабачыць мужу настольні шмат.

І таму ёсць шматлікія прыклады. Гісторыя сведчыць, што нават у выпадках couple-power часам эмоцыі перамагаюць халодную логіку. Так, у 2008 годзе малады Джон Эвардс выставіў сваю кандыдатуру на праймерыз кандыдата на прэзідэнцкія выбары ад дэмакратаў. Аднак па ходу кампаніі ягоная асістэнтка стала цяжарнай. Джон перакапаў свайго асістэнта прызнаць сябе бацькам дзіцяці. Аднак у выніку праўда ўсё роўна ўсплыла. Шакаваная паводзінамі Джона, яго жонка папросту памерла. А праблемы Эдвардса на гэтым не закончыліся. У час кампаніі ён зашмат узяў з партыйнай касы на тое, каб спакусіць тую самую асістэнтку. Зараз яго чакае судовы працэс.

Самае цікавае, што сем'і палітыкаў, на думку прэсы, асуджаныя на сэксуальныя скандалы. Палітыкі атрымліваюць уладу над людзьмі. Прычым, чым далей яны рухаюцца па кар'ернай лесвіцы, чым больш у іх улады, тым большае іх лібіда. Гэта выклікае пачуццё, што табе дазволена ўсё, у тым ліку ў галіне сэксуальных паводзін. Таму пасутнасці сэксуальны скандал з удзелам Строс-Кана позна ці рана ўсё роўна меў бы месца. Іншая справа, дзе... Калі б у Францыі, то, хутчэй за ўсё, закончылася тым, што Эн Сінклер зноў паціснула б плячыма.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ДАМІНІК СТРОС-КАН



Былы прэзідэнт Міжнароднага валютнага фонду, які чакае суда пад хатнім арыштам, наўрад ці ведае, што яго гісторыя зрабіла фурор у свеце кіно. Сцэнарысты, прадзюсары і рэжысёры змагаюцца за тое, каб першымі экранізаваць прыгоды дырэктара фонду. Калі верыць газеце «Figaro», на цяперашні дзень ужо напісаныя як мінімум 17 сцэнараў сэксуальных прыгод Дамініка ў Нью-Ёрку. Галоўная пасланне: магутны палітык і эканаміст становіцца ахвярай сваіх унутраных дэманаў. Адначасова ёсць заклікі зрабіць героем карціны чарнаскурую пакаёўку, якая стала аб'ектам атакі лібіда белага чалавека, чытай каланізатара. Ужо неафіцыйна абраны акцёр, самы галоўны кандыдат на ролю DSK (абрэвіятура ад Дамінік Строс-Кан). Ім стаў славуты француз Жэрар Дэпардзье. Самае цікавае, аднак, у тым, што ёсць заклікі, каб чарнаскурую дзяўчыну, да якой заляцаецца банкір, згуляла Катрын Дэнёў. Публіцы вельмі падабаецца дуэт Дэпардзье — Дэнёў. Ім усё роўна, што Катрын Дэнёў — дама бальзакаўскага ўзросту і ў дадатак мае белую скуру. Што тычыцца рэжысёра, то наверсе спісу кандыдатаў Олівер Стоўн — вядомы амерыканскі рэжысёр левых поглядаў.

### УЛАДЗІМІР ІЛЛЮХІН



Губернатар Камчацкага краю абвясціў пра ўзмацненне жорсткасці міграцыйнай палітыцы аж да стварэння канцэнтрацыйнага лагеру. Усіх гастарбайтараў, якія працуюць у сталіцы рэгіёну, хутка перасяляць у асобнае мястэчка, якое знаходзіцца на 12-кіламетровай адлегласці ад Петрапаўлаўск-Камчацкага. Там на месцы старога бетоннага заводу будзе пабудаваны асобны горад, які можа прыняць 500 чалавек. У ім пад аховай міліцыі будуць жыць імігранты. Дакладней сказаць, начаваць, паколькі кожную раніцу іх будуць адвозіць працаваць на адмысловыя аб'екты. Улады, па іх словах, пайшлі на такі крок з-за росту колькасці злачынстваў, якія здзяйсняюцца прыезджымі працоўнымі. Праект будаўніцтва канцлагеру ўжо прыняты на ўзроўні рэгіянальнага ўрада. Адначасова афіцыйна забаронена ўсім прадпрыемствам браць на працу іншаземцаў. Мяркуючы па ўсяму, гэта толькі кветачкі. У расійскай прэсе пачалася дыскусія наконт таго, каб увогуле замяніць гастарбайтэраў зэкамі. Ноч яны могуць праводзіць у турме, а ўдзень рабіць тое, што зараз робяць прыезджыя таджыкі або каўказцы — так гучыць для шмат каго новая версія канчатковага рашэння праблемы гастарбайтэраў.

### ХУАН КАРЛАС ІСАГІРЭ

Сябра баскскага левага нацыяналістычнага блоку «Bildu» абраны на пасаду мэра буйнага гораду Сан-Себасцьян (баскі называюць яго Данасція). Абранне Ісагірэ падобна на гісторыю Папялушкі. Яшчэ ўчора Ісагірэ, як і яго сябры, быў маргіналам. Дзяржава забараніла ім удзельнічаць у выбарах з-за былых сувязяў з тэрарыстычнай нацыяналістычнай групоўкай ETA. Заявы нацыяналістаў наконт таго, што метады ETA няправільныя, не змянілі пазіцыю Мадрыду. У выніку такая трактоўка дэмакратыі стварыла нацыяналістам вялікую падтрымку электарату, і першыя выбары, на якія іх пусцілі, прынеслі *abertzale* (так называюць левых нацыяналістаў) сенсацыйную перамогу. З 252 мэраў баскскіх гарадоў і мястэчак, абраных 22 мая, сто балатаваліся па выбарчаму спісу «Bildu». Яшчэ адзін удар па лагеру іспанскіх вялікадзяржаўнікаў: за партыі, якія падпісалі так званы пакт *Anti-Bildu-Pakt*, галасавала толькі траціна выбарцаў краю. Спецыялісты не выключаюць, што па выніках наступных выбараў у парламент прадстаўнікі «Bildu» могуць аказацца ў складзе ўраду аўтаноміі. Гэта можа значыць перагляд адносін паміж Краінай Баскаў і цэнтрам.



▸ СПАДЧЫНА

# ТАЛМУДЫСТ МААРШАК

Лявон ЦЕЛЕШ

**У некаторых нашых сугрaмадзян і па сённяшні дзень існуе перакананне, што да кастрычніцкага перавароту 1917 года на Беларусі нічога не было: ні сваёй культуры, ні пісьменства, што мы жылі ў цемры, і ў лапцюжную Беларусь прынеслі цывілізацыю расійскія бальшавікі.**



Арон Шмуэль Кайдановер за працай, у Койданаве




Вокладка адной з яго кніг

Мне ўспамінаецца эпізод 20-гадовай даўніны. У час кампаніі па выбарах у Вярхоўны Савет Беларусі 12-га склікання у двары аднаго з буйных мікраёнаў Мінска перад выбаршчыкамі са сваёй праграмай выступаў вядомы беларускі вучоны, грамадскі дзеяч, кандыдат у дэпутаты. З дынаміка гучалі цудоўныя беларускія песні, у падтрымку кандыдата выступіў і гонар беларускага народа пісьменнік Васіль Быкаў. Людзей сабралася шмат. І раптам я пачуў за сваёй спінай на рускай мове чыюсьці прамову. Вось, маўляў, сабраліся нацыяналісты са сваімі дзікімі песнямі, мала ім рускіх песень, павылазілі нядаўна з пячор і балот і рвуцца да ўлады. Гэта мы, рускія, прынеслі сюды культуру. Я азірнуўся. Аўтарам гэтых слоў быў чалавек сталага ўзросту. Як мне падказалі мясцовыя жыхары, выхадзец з Расіі, былы высокі ваенны чын.

За мінулыя 20 гадоў людзей з такім пячорным мысленнем, на шчасце, паменшала. Свет дазнаўся, што шмат выдатных людзей нашай краіны ці іхнія нашчадкі ўзбагацілі культуру як Расіі, так і іншых краін свету. Пра аднаго з такіх выдатных нашых суайчыннікаў сярэднявечча і пойдзе размова.

У пачатку XVII стагоддзя Койданава (зараз Дзяржынск) было буйным па тым часе мястэчкам. У ім налічвалася больш за 200 дамоў, каля 1500 жыхароў. Існавалі ў мястэчку хрысціянскія царквы, сінагогі, рынак, некалькі корчмаў, замак, праводзіліся буйныя кірмашы. Менавіта тут у 1624 годзе ў сям'і высокаадукаванага койданаўскага рабіна Ізраіля Кайдановера нарадзіўся Арон Шмуэль, які пры жыцці вызначыўся як выдатны талмудыст, пісьменнік, адзін са значных рабінаў свайго часу. Арон — імя, якое яму было нададзенае пры нараджэнні, а пасля цяжкай хваробы яму было дадзенае другое імя — Шмуэль, што азначае "Бог пачуў».

Дзіцячыя гады Арона Шмуэля прайшлі ў Койданаве. Калі ж прыйшоў час навучання, бацька адправіў свайго сына ў Берасце, дзе Арон Шмуэль у мясцовым ешыбоце атрымаў талмудыцкую і рабінскую адукацыю. Пасля заканчэння вучобы ён нейкі час быў рабінам у Люблінскім ваяводстве, адкуль, ратуючыся ад пагромаў казацкага паўстання пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага, перабраўся ў старажытную беларускую сталіцу — Вільню. У гэтым горадзе Арон Шмуэль Кайдановер быў адным з яўрэйскіх суддзяў. У Вільні ў 1650-м годзе ў яго нарадзіўся сын Ціві Гірш, які стаў вядомым маралістам і кабалістам, настаўнікам яўрэйскай этыкі.

У 1654 годзе пачалася крывавая вайна рускай дзяржавы з Рэччу Паспалітай. Рускія салдаты і ўкраінскія казакі бязлітасна забівалі мірных жыхароў, палілі беларускія гарады і вёскі. У Вільні імі быў абрабаваны дом Арона Шмуэля і спалена бібліятэка з каштоўнымі рукапісамі. Ля Любліна ў 1656 годзе сын Арона быў цяжка паранены казакамі, а дзве ягоныя дачкі былі забітыя ў яго на вачах. Разам з сынам Арон Шмуэль Кайдановер мусіў вярнуцца ў Койданава. Але вайна і тут дагнала яго. Мястэчка Койданава было ўшчэнт разрабаванае і спаленае рускімі захопнікамі, і Арон Шмуэль Кайдановер пераехаў у Чэхію, а затым — у Германію, дзе займаў пасаду рабіна і выкладаў талмуд. Некаторы час ён жыў і працаваў у горадзе Брыск (яўрэйская назва Берасця), а таксама ў Кракаве.

Памёр выдатны талмудыст у 1676 годзе ў Хмельніку (Украіна) як сапраўдны праведнік, вымаўляючы малітву падчас паседжання рабінаў. Ягоны сын, Цыві Гірш, вярнуўся ў Вільню і зрабіўся адным з кіраўнікоў гарадской яўрэйскай грамады. Затым ён адправіўся ў Франкфурт-на-Майне, дзе жыла сям'я ягонага цесця. Тут ён выдаў цэлы шэраг бацькавых кніг са сваімі прадмовамі і нататкамі. Трэба адзначыць, што Арон Шмуэль Кайдановер напісаў шмат значных твораў, якія і па сённяшні дзень перавыдаюцца і вывучаюцца ў ешыботах. Найбольш значнымі яго творамі з'яўляюцца «Дабраславёнае ахвярапрынашэнне» («Birchat ha – Zebach») з прадмовай і аўтабіяграфіяй, «Блаславенне Шмуэля» («Birchat Schemuel») — казанні на тэмы з Торы, «Вера Шмуэля» («Emunat Schemuel») па пытаннях шлюбнага права і іншыя.

Акрамя свайго імя і прозвішча Арон Шмуэль Кайдановер меў таксама мянушку Маардшак, што з'яўляецца абрэвіятурай на іўрыце «Настаўнік наш і рабін Шмуэль Кайдановер» («Morenu Rabbi Shmuel Kaidanover»). Некаторыя даследчыкі лічаць, што ён меў таксама родавую мянушку «Клюгер», што азначае «Разумны». Сёння шмат носьбітаў прозвішча Маршак пражываюць у розных гарадах Беларусі і па-за яе межамі. Адным са знакамітых носьбітаў гэтага прозвішча і прамым нашчадкам Арона Шмуэля Кайдановера з'яўляецца вядомы расійскі пісьменнік, драматург, перакладчык, дзіцячы паэт Самуіл Якаўлевіч Маршак, вершамі якога захапляўся з маленства кожны з нас.

З энцыклапедычных крыніц вядома, што нарадзіўся Самуіл Маршак у Варонежы, у сям'і заводскага тэхніка-майстра Якава Міронавіча Маршака. У яго сям'і па бацькоўскай лініі, пачынаючы ад далёкага койданаўскага продка Ізраіля Кайдановера, усе былі рабінамі, за выключэннем бацькі і дзеда. Маці была даволі адукаванай і паходзіла ад рабіна Віцебска Бэра Абрамавіча Гітэльсона. Калі будучаму пісьменніку споўнілася 6 гадоў, яна з ім і іншымі дзяцьмі перабралася жыць да сваіх бацькоў, у Віцебск, дзе і прайшлі дзіцячыя гады Самуіла Маршака. Дзед знаёміў Маршака з традыцыямі продкаў, са Свяшчэнным Пісаннем. Вучыў дзед малога Маршака і рускай мове, бо лічыў, што яўрэйскую мову ён асвоіць і на вуліцы.

Па ўспамінах Самуіла Маршака, у Віцебску ў тыя часы нават коні размаўлялі на ідыш. Як бачна, карані радаводу выдатнага пісьменніка, паэта па матчынай і бацькавай лініях знаходзяцца на Беларусі. Гэта наша бласлаўлёная беларуская зямля дала Расіі выдатнага пісьменніка, паэта, драматурга, перакладчыка Самуіла Якаўлевіча Маршака.

▸ ВЫСТАВА

# ХТО ГЛЯДЗІЦЬ НА ЗОРКІ?

Аляксей ХАДЫКА

**8 чэрвеня ў Гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе» адчынілася выстава «Viatoris глядзіць на зоркі» прафесара мастацкага факультэта Педагагічнага ўніверсітэта ў Кракаве Пятра Яргуша.**



Аўтограф ад мастака Пятра Яргуша



Дырэктар музея Мікалай Паграноўскі на ганку музея. За ім — работа П. Яргуша

Польскі інстытут у Мінску дапамог арганізаваць выставу, адпаведна, на адкрыцці не бракавала дыпламатаў, на чале з дырэктарам інстытута Пётрам Казакевічам і амбасадарам Францыі Мішэль Рэнэры.

Падзея неардынарная і знакавая — выстава сталічнага ўзроўню па-за межамі сталіцы. Тым болей што і мастак, 51-гадовы жывапісец, знаходзіцца ў росквіце творчай кар'еры — толькі за мінулыя месяцы яго экспазіцыі адчыняліся ў Кракаве і Варшаве, а таксама ў Клужы-Напока ў Румыніі. А агулам толькі персанальных выстаў Пётр Яргуш зладзіў каля 60. Ён з'яўляецца арганізатарам і ініцыятарам жывапісных пленэраў на Украіне, у бліжэйшы час збіраецца ў Дагестан. Супрацоўнічае з Міністэрствам культуры і нацыянальнай спадчыны РП пры рэалізацыі праграмы «Gaude Polonia». У 2008 годзе ўзнагароджаны рэктарам Педагагічнага ўніверсітэта за сукупнасць педагагічнай і мастацкай дзейнасці. У 2011 годзе адзначаны Сярэбраным медалём Міністэрства нацыянальнай адукацыі. Мастак-вандроўнік, ён і ў свае карціны ўкладае адчуванне і сэнс знакаў падарожжа ў часе, прасторы жыцці.

Паслухаем мастака: «Карціна — як след. Карціна — як знак. Закляцце. Паказальнік дарог. Як крыж, які падрастаючы сын атрымлівае ад свайго бацькі. Як талісман у дарогу, як знак чатырох бакоў свету і прадказанне будучай сустрэчы».

Таму тыя працы, якія госці выставы ўбачылі ў Заслаў'і, пакідалі ўражанне сімвалаў-іерогліфаў, частак вялікага тэксту, які апанаваў сцены залі і прасіўся на вуліцу. Два вялікія творы аздаблялі фасад будынка пры ўваходзе — улюбёны прыём майстра, які нярэдка экспануе свае работы папросту на вуліцы, на слупах для аб'яў. Вялізныя, бы плакаты, напісаныя шырокімі росчыркамі пэндзля, з недаказанымі вобразамі, якія мусяць нараджаць уражанні і асацыяцыі, як успаміны, якія ўсплываюць у памяці.

Пётр Яргуш так і кажа : «Я прывёз у Мінск аповесць. А аповесць вымагае Тваіх вушэй, як карціна вымагае Тваіх вачэй… Я прывёз і мой смутак па аповесці і сваю рэзкасць, і нярэзкасць бачання…» Гэта нефігуратыўнае мастацтва? Не, так сказаць нельга. З фрагментаў, з ліній і гульні фарбаў і форм мастак канструюе настрой. А настрой накіроўвае сваімі рытмамі вашае ўспрыняцце і фантазію. Памятаеце вялізныя работы-рытмікі беларуса з Польшчы Лёніка Тарасевіча? Вось так і Яргуш фармуе вібрацыі вашых эмоцый, але яго прыёмы, бадай, больш фігуратыўныя.

Адным словам, адпраўцеся бліжэйшымі днямі ў старажытнае Заслаўе, вы атрымаеце магчымасць не толькі пазнаёміцца з яго класічнымі архітэктурнымі помнікамі і гістарычнымі мясцінамі. Але займееце шанс на пэўны час прасякнуцца атмасферай сучаснай, сусветнага ўзроўню авангарднай выставы, якая праэкспанавана пры гэтым з адметным густам — дзякуй дырэктару музея Мікалаю Паграноўскаму.

Такое спалучэнне, між іншым, ставіць пытанне пра крытычны недахоп у цэнтрах гістарычнага турызму ў Беларусі (Нясвіж, Мір, Навагрудак, і далей па спісе) невялікіх галерэй сучаснага мастацтва — дзеля паказу не толькі твораў знакамітых гасцей краіны, але і беларускіх мастакоў. Вялікая мастацкая супольнасць у сталіцы — добра, але не дастаткова для паўнавартаснага культурнага жыцця краіны.

Дарэчы, хто не зможа паехаць у Заслаўе, частку аднайменнай выставы да 24 чэрвеня зможа пабачыць у галерэі TUT.BY — на вуліцы Веры Харужай, 1А, 6 паверх.

ГАДАВІНА

# МЫ ЗА ЦАНОЙ НЕ ПАСТАІМ…

70 гадоў таму, 22 чэрвеня 1941 года, пачалася Вялікая Айчынная вайна. Але дасюль не сціхаюць спрэчкі наконт таго, хто быў вінаваты ў трагедыі першых дзён вайны, чаму Чырвоная Армія не здолела стрымаць націск фашысцкай Германіі. Прапануем вашай увазе ўрывак з даследавання гісторыка Ігара Кузняцова.

Ігар КУЗНЯЦОЎ,
кандыдат гістарычных навук

## Хто вінаваты?

У 1920-я — пачатку 1930-х гадоў савецкая ваенная тэорыя займала перадавыя пазіцыі ў сусветным ваенным мастацтве і значна апярэджвала канцэпцыі стратэгаў капіталістычных краін. Ваенныя тэарэтыкі У.К. Трыандафілаў, Г.С. Ісерсан, Б.М. Шапашнікаў стварылі тэорыю "глыбокай аперацыі", у якой смела прагназавалі характар і спосабы вядзення будучай вайны з шырокім выкарыстаннем танкаў, авіяцыі, паветрана-дэсантных войскаў.

Маршал М.М. Тухачэўскі выступаў за масавую механізацыю і матарызацыю арміі, распрацоўку і ўкараненне самай сучаснай баявой тэхнікі. Асаблівую ўвагу Тухачэўскі па-прароцку надаваў пачатковаму перыяду вайны і заклікаў «быць асабліва моцнымі і энергічнымі» ў момант развязвання ўзброенага канфлікту. «Першы перыяд вайны, — казаў ён, — павінен быць яшчэ ў мірны час правільна прадбачаны, яшчэ ў мірны час правільна ацэнены, і да яго трэба правільна падрыхтавацца».

Перадваенныя рэпрэсіі перакрэслілі ўсё дасягнутае ў галіне стратэгіі і аператыўнага мастацтва. Прагрэсіўныя ідэі і тэорыі былі абвешчаны шкодніцкімі. У кіраўніцтве ўзброенымі сіламі ўзяла верх установка «коннікаў» — Варашылава, Будзёнага, Куліка, Шчадэнкі, якія дагматычна чапляліся за досвед грамадзянскай вайны.

Варашылаў з трыбуны XVII з'езду партыі сцвярджаў: «Неабходна... раз і назаўсёды скончыць са шкодніцкімі "тэорыямі" пра замену каня машынай». Яму падтакваў Шчадэнка: «Вайна матораў, механізацыя, авіяцыя і хімія прыдуманы ваенспецамі. Пакуль галоўнае — конік. Вырашальную ролю ў будучай вайне будзе адыгрываць конніца».

Спроба С.К. Цімашэнкі, які прыйшоў у 1940 годзе ў кіраўніцтва Наркаматам абароны на змену Варашылаву, адрадзіць ідэі Тухачэўскага ва ўмовах культу не магла ажыццявіцца. Сталіна абвясцілі адзіным і бясспрэчным аўтарытэтам і ў галіне ваеннага мастацтва. Паступова распаўсюджваліся дабрадушнасць і шапказакідальніцкія настроі. Палявы статут 1939 года патрабаваў весці вайну «наступальна, пераносячы яе на тэрыторыю суперніка» і шляхам дасягнення «рашучай перамогі малой крывёй».

Жорсткая рэчаіснасць першых дзён вайны развеяла ілюзіі. Але каса рэпрэсій настолькі грунтоўна абезгаловіла войска, што замшэлыя прыхільнікі тачанак і клінкоў і новаспечаныя генералы, учорашнія лейтэнанты і



капітаны, якія без году тыдзень камандавалі дывізіямі і арміямі, разгубіліся, не здолелі разабрацца ў абстаноўцы, а тым больш аваладаць сітуацыяй.

Сёння апублікавана шмат інфармацыі пра сталінскі тэрор ва ўзброеных сілах. Але дакладных звестак да гэтага часу няма. Лічыцца, што ў перадваенны перыяд рэпрэсавана 44 тысячы чалавек каманднага саставу, звыш паловы афіцэрскага корпуса. Па дадзеных К. Сіманава, было знішчана 80% вышэйшых і 50% старшых камандзіраў. Генерал Д. Валканогаў сцвярджаў, што на вайне загінула 600 савецкіх генералаў, а падчас даваенных рэпрэсій мы страцілі ў тры разы больш вайскоўцаў у званнях, прыроўненых да генеральскага.

Ва ўсякім разе, калі Сталін папракнуў Варашылава за няўдачы ў савецка-фінскай вайне, той, хоць заўсёды беспярэчна згаджаўся з праваднром, не вытрымаў і выгукнуў: «А з кім жа ваяваць?! Усе камандзіры, здольныя думаць, расстраляныя, а новых няма!»

Асноўным аргументам Гітлера для заспакаення ўласных генералаў, якія запанікавалі перад нападам на СССР, былі словы: «Чырвоная Армія абезгалоўлена... яна саслабленая, як ніколі. Трэба ваяваць, пакуль кадры не вырастуць зноў».

Як стала вядома ўжо пасля вайны, Гітлер, які ведаў пра рэпрэсіі, што пракаціліся па Чырвонай Арміі ў 1937–1939 гадах, запатрабаваў даклад ад сваіх органаў выведкі пра якасць каманднага складу РККА. За паўтара месяцы да пачатку вайны, на падставе даклада палкоўніка Крэбса, ваеннага аташэ Германіі ў СССР, ды іншых звестак, фюрэру паведамілі: рускі афіцэрскі корпус саслаблены не толькі колькасна, але і якасна... Супернік не без падставы ўключаў у лік надзвычай спрыяльных фактараў для Германіі фактычную замену цэлых звёнаў ваеннай сістэмы новымі кіраўнікамі... Гэта не проста заахвоціла, але і наўпрост падштурхнула Гітлера да фарсіравання падзей.

Начальнік германскага генштаба генерал фон Бек у 1938 годзе пісаў: «З рускай арміяй можна не лічыцца як з ваеннай сілай, бо крывавыя рэпрэсіі падарвалі яе дух, ператварылі ў інертную машыну».

«Першакласны склад савецкіх вышэйшых ваенных кадраў знішчаны Сталінам у 1937 годзе, — казаў Гітлер генералу Кейтэлю. — Такім чынам, неабходны розум у падрастаючай змене яшчэ пакуль адсутнічае». А на нарадзе вышэйшых нацысцкіх генералаў з нагоды падрыхтоўкі нападу на СССР 9 студзеня 1941 года ён заявіў: «У іх няма добрых палкаводцаў».

Нельга не пагадзіцца з К. Сіманавым і маршалам А.М. Васілеўскім. Калі пісьменнік сказаў, што без трыццаць сёмага не было б параз сарок першага, маршал адказаў, што «без трыццаць сёмага года, магчыма, не было б наогул вайны ў сорак першым годзе: Гітлер не рашыўся б яе пачаць».

Рэпрэсіі супраць каманднага складу не толькі абезгаловілі ўзброеныя сілы, але і сур'ёзна падарвалі маральны дух і стан дысцыпліны ў арміі ў цэлым. Аўтарытэт камандзіраў рэзка пахіснуўся. Ім не верылі, іх загады абвяшчаліся шкодніцкімі.

Квітнелі даносы, якія ўсяляк заахвочваліся. Органы НКУС умешваліся ва ўсё, падмяняючы камандзіраў. Развілося п'янства, самавольныя адлучкі, дэзерцірства.

Да пачатку вайны Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот прыйшлі з амаль цалкам знішчаным асноўным касцяком войска. У цэлым у перыяд сталінскіх рэпрэсій было знішчана вышэйшага і старшага каманднага складу больш, чым мы страцілі за ўсе чатыры гады вайны.

ВЫСТАВА

# ВЫКРАДЗЕНАЕ ДЗЯЦІНСТВА

Алена ЗЯЛЕВІЧ,
ст. нав. супрацоўнік музея-сядзібы «Пружанскі палацык»

**У музеі-сядзібе «Пружанскі палацык» адбылася выстава работ вядомага габрэйскага мастака Мошэ Бярнштэйна. Мастака і паэта, чалавека, які спазнаў жахі Другой сусветнай вайны і занатаваў яе назаўсёды ў сваёй памяці. На выставе быў прадстаўлены цыкл яго графічных работ «Габрэйскія дзеці», створаны ў 1973 годзе.**





Мошэ Бярнштэйн у адмысловай сентыментальнай манеры выяўляе памяць пра габрэйскую культуру, якая сышла назаўжды. У яго палотнах — плач і несуцешны душэўны боль пра блізкіх, што пакутніцкі загінулі ў агні Халакосту. Хваравітыя сны мастака, якія мучылі яго ўсё жыццё. Дахі старых хат, што чулі матчыны малітвы. Цёмныя, як сухія лісцікі на ветры, абрысы габрэйскіх дзетак, бяздонныя патухлыя вочы і слёзы, што гарачымі кроплямі падаюць на зямлю.

Лейтматывам усяго жыцця мастака-паэта былі словы: «Я — вечная знічка майго згарэлага народа». Знічка ягонага жыцця згасла пяць гадоў таму.

Нарадзіўся Мошэ Бярнштэйн у 1920 годзе ў горадзе Бяроза ў сям'і артадаксальных габрэяў. У раннім дзяцінстве выявіў свой талент жывапісца і паэта. Прафесійную адукацыю атрымаў у мастацкай акадэміі Вільні, дзе вучыўся з 1935 года. У 1939-м апынуўся па ўсходні бок новай мяжы. Калі фашысты звозілі габрэяў у Беластоцкае гета, ён збег і быў эвакуяваны ў Саратаў. Некалькі гадоў працаваў у калгасе, пазней падзарабляў мастаком у адной з вытворчых майстэрняў. Адарванасць ад блізкіх, а затым — іх трагічная гібель ад рук фашыстаў назаўжды пакінулі незагойную рану ў душы Бярнштэйна. Восем гадоў, пражытых маладым мастаком у стане чалавечага гора, адбіліся на фармаванні знойдзенага ім стылю.

У 1947 годзе Мошэ выехаў у Ізраіль і, прайшоўшы, як і шматлікія, праз англійскія лагеры на Кіпры, у год нараджэння новай дзяржавы стаў яе грамадзянінам. У жніўні 1948-га быў мабілізаваны ў войска абароны Ізраілю. А праз год ужо стаў удзельнікам выставы «Аманім алім» — «Мастакі-рэпатрыянты». Поўнае прызнанне атрымаў пасля персанальнай выставы ў прэстыжнай тэль-авіўскай галерэі «Кац».

За 50 гадоў насычанай творчай працы адбылося звыш 50 выстаў з яго ўдзелам. Яго працы некалькі разоў экспанаваліся ў Расіі, ЗША, Францыі, Галандыі і Італіі. У 1998 годзе карціны Бярнштэйна экспанаваліся на міжнародным фэсце тэатра ў Парме (Італія), у 1999-м за «дакументацыю зніклага габрэйскага свету» мастак атрымаў узнагароду Інстытута вывучэння Халакосту (Ізраіль).

Бярнштэйн выдатна валодаў і тэмперай, і акрылавымі фарбамі, але цяжкая алергія не дазваляла доўга працаваць у гэтай тэхніцы. Любімым яго матэрыялам была туш. І трэба сказаць, выпрацаваная Бярнштэйнам адмысловая манера «чорным па белым» найлепш падыходзіла для настальгічнай тэматыкі яго твораў. Пра арыгінальны почырк Бярнштэйна выдатна і лаканічна сказаў яго шматгадовы сябар і паплечнік паэт Аўраам Суцкевер: «Яго чорна-белае відаць нават у цемры».

Мошэ Бярнштэйн стварыў непаўторныя творы жывапісу, малюнка і графікі. За ўсё сваё доўгае і насычанае творчае жыццё Мошэ не імкнуўся за навамоднымі павевамі. Ён заўсёды быў самадастатковы, адасоблены ў тэматыках. Яго лічылі двойчы фанатыкам: як мастака і як паэта. Але і ў тым, і ў другім амплуа ён быў фанатыкам адной тэмы — Халакосту. Часы габрэйскага мястэчка, яго побыт, уклад апаэтызаваны гэтым вялікім майстрам з сілай, супастаўнай з творчасцю Марка Шагала.

Вялікі ілюстраваны планшэт з 12-ю арыгінальнымі работамі і 12-ю ілюстраванымі аркушамі з вершамі мастака прэзентаваў музею наш зямляк, бізнэсмэн Аўраам Харшалом, які цяпер пражывае ў г. Рышон-ле-Цыён каля Тэль-Авіва. Яго з Бярнштэйнам звязаў падобны лёс — ён бачыў сваімі вачамі жахі Асвенцыма, дзе навечна засталася ўся яго вялікая сям'я, якая жыла калісьці на вуліцы Тармасова ў Пружанах. Аўраам Харшалом з'яўляецца ініцыятарам стварэння мемарыяла памяці ахвярам пружанскага гета.

*Я не забыўся. Мне не спыніцца*
*Шукаю твары мне знаёмыя*
*з дзяцінства*
*Шукаю іх часцінку, семіцкі*
*профіль тонкі*
*Шукаю вочы габрэйскага дзіцяці*
*і чую голас звонкі.*

***(М. Бярнштэйн «Роздумы»)***

▸ КНІГАРНЯ

# УНІЯЦКАЯ ЦАРКВА

Яўген ЛЕЦКА

**Кніга доктара гістарычных навук Леаніда Лыча «Уніяцкая царква Беларусі» з'яўляецца арыгінальным даследаваннем актуальнай і важнай тэмы. Вядома, што на працягу досыць значнага гістарычнага прамежку ўніяцтва было адной з самых моцных хрысціянскіх канфесій у Беларусі.**




Ідэя ўніяцтва была папулярнай як сярод свецкіх валадароў Вялікага Княства Літоўскага, так і іерархаў духоўных, многія з якіх жадалі самастойнасці ад Рускай праваслаўнай царквы Маскоўскага патрыярхату, які, у сваю чаргу, рабіў усё магчымае, каб утрымаць беларускае праваслаўе ў поўным сабе падпарадкаванні.

Аднак з утварэннем Рэчы Паспалітай, у якую як раўнапраўныя ўвайшлі Вялікае Княства Літоўскае і Польшча, адбываецца ўсё больш ціск моцнай заходняй суседкі на Беларусь, у тым ліку і ў абсягу канфесійным, што выяўлялася ў экспансіі каталіцызму. А гэта ставіла сітуацыю на мяжу міжканфесійнай варажнечы і нават вайны. У гэтай сітуацыі ідэя уніі ўяўлялася адным з найбольш прыдатных варыянтаў вырашэння надзвычай складанай як рэлігійнай, так і дзяржаўнай праблемы.

У кнізе распавядаецца пра падрыхтоўку і падпісанне Берасцейскай царкоўнай уніі. Даследчык паказвае, што ў першы час яе ідэя не была папулярнай сярод шырокіх пластоў народа. Аднак яна набірала моц, трывалась і папулярнасць дзякуючы таму, што замацоўвалася на беларускім нацыянальным, народным грунце — набажэнства вялося на роднай беларускай мове, на ёй стваралі высока адухоўленыя творы такія волаты духу, першаіерархі ўніяцкай царквы, як Язэп Руцкі і многія іншыя, адбываецца сапраўдны ўзлёт сакральнага жывапісу і архітэктуры.

Сітуацыя рэзка памянялася пасля захопу Беларусі Расійскай Імперыяй. Пачынаецца, па сутнасці, разгром уніяцтва. У 1839 годзе наступае яго афіцыйная забарона. Тры апошнія параграфы кнігі названы «Цяжкія паследкі дэунізацыі», «Не памірала памяць пра унію», «Пакутны шлях адраджэння».

Першае, невялікім накладам, выданне кнігі «Уніяцкая царква Беларусі» разышлося імгненна. З улікам шматлікіх просьбаў кніга перавыдадзена.

▸ ФЭСТ

# МУЗЫЧНАЕ СВЯТА НА ТРАВЕ

Генадзь КЕСНЕР

**Нарэшце заўзятары сапраўднай беларускай музыкі дачакаліся свайго свята, якое, не па віне арганізатараў, адклалася амаль на тры тыдні: 11 чэрвеня ўсё ж адбыўся «Канцэрт на траве» з удзелам як маладых выканаўцаў, так і сапраўдных волатаў айчыннага альтэрнатыўнага музычнага мастацтва.**


Выступае гурт «Далі»

На фэст, які быў зладжаны на хутары «Шаблі» ў вёсцы Малое Запруддзе, што ў Валожынскім раёне, сабраліся сотні людзей. Многія прыязджалі цэлымі сем'ямі. Арганізатары зрабілі так, каб усе жадаючыя за невялікую дадатковую плату змаглі нават пераначаваць у «Шаблях», балазе на хутары былі прадугледжаны і парковачныя месцы, і пляцоўка пад намётавы лагер.

Тут жа, ля канцэртнай пляцоўкі, можна было паласавацца сапраўдным далікатэсам — у невялічкім закутку мясцовыя кухары прапанавалі паспытаць гуляш з… «страўсяціны» ды хатнія блінчыкі з гэткім жа змесцівам. Справа ў тым, што зусім побач з «Шаблямі» знаходзіцца гаспадарка, дзе на вытворчым узроўні вырошчваюць чорных афрыканскіх страўсаў, вось адтуль і далікатэсы.

Прыкладна гадзіне а трэцяй па апоўдні пачаўся канцэрт. Напачатку выступалі гурты больш маладыя — «Йо-Йо», «2MORROW2LATE», «9 міліметр», «Далі». А 19-й на подыуме з'явіўся Лявон Вольскі, які першую гадзіну ўпершыню на вольным паветры прэзентаваў сваю новую сольную праграму на вершы беларускіх класікаў «Белая яблыня грому» (першы паказ гэтай праграмы летась у канцэртнай зале «Мінск» меў велізарны поспех). Узвышаны настрой «зубра» беларускага року тлумачыўся тым, што ў гэты дзень у ягонай жонкі Ганны Вольскай быў дзень народзінаў, таму Вольскі і прысвячаў сваё выступленне любай жанчыне.

Гадзінай пазней, праз дзесяціхвілінную паўзу, Вольскі выступаў ужо разам з «Крамбамбуляй», прадставіўшы гледачам новы альбом «Драбадзі — Драбада». Публіка проста шалела ў экстазе! І не дзіва, бо, як вядома, «Крамбамбуля» трапіла ў так званы «чорны спіс» беларускіх выканаўцаў, і ўбачыць зараз музыкаў жыўцом у Беларусі — вялікая рэдкасць. А яшчэ калі Вольскі славіў кураж, то тут ужо не вытрымае нават слуп. Сярод тых, хто атрымліваў асалоду ад выступаў беларускіх выканаўцаў, быў і пасол Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан — «самы беларускі замежны амбасадар», які не прапускае, бадай, аніводнай сапраўды беларускай культурніцкай падзеі.

Ужо калі сцямнела, на сцэну выйшлі яшчэ адны любімцы публікі — «J:Mors», якія паказалі народу праграму «Многа Неба». Лідар калектыву Уладзімір Пугач таксама быў у асаблівым гуморы, бо ягоная дачка скончыла школу, і менавіта 11 чэрвеня ў яе быў выпускны баль, адкуль Валодзя, уласна кажучы, і прыехаў на канцэрт. Лішне казаць, што і ён выступаў на вялікім уздыме, а публіка прымала яго не горш за Лявона.

Асаблівую падзяку і гледачы, і музыкі выказвалі арганізатару «Канцэрта на траве» Валодзю Шаблінскаму — можна толькі сабе ўявіць, колькі высілкаў яму каштавала і дабіцца дазволу мясцовых уладаў на правядзенне фэсту, і заключыць дамовы з міліцыяй, аховай, «хуткай дапамогай», пажарнікамі, забяспечыць харчаванне гасцей і гэтак далей. Сапраўдны профі сваёй справы!

Карацей, свята жыцця ўдалося! Цяпер хочацца працягу. Вельмі-вельмі!

▸ ЦІКАВА

# КОМІКС ПРА СУПЕРПУЦІНА

Андрэй РАСІНСКІ

**Беларус Сяргей Каленік, які трапіў у Маскву, прапануе комікс, дзе Уладзімір Пуцін знішчае медытацыяй тэрарыстаў і з дапамогай нанаагента Мядзведзева давіць аўтобусам дэмакратаў-зомбі.**




Маляваная гісторыя мае агульную шыльду: «Чалавек Як Усе». 20 мая на сайце superputin.ru быў размешчаны першы эпізод комікса — «Стоеная пагроза».

Дзеянне ў графічным апавяданні адбываецца сёлетній вясной, «за год да канца свету». Уладзімір Пуцін — у касцюме дзюдаіста — дзякуючы звышнатуральнае медытацыі трапляе на тайнае пасяджэнне Аль-Каіды. На сцяне логава ў спальным раёне Масквы вісіць партрэт Ельцына з дарчым надпісам: «Шамілю ад Барыса». Высвятляецца, што барадатыя тэрарысты падклалі бомбу ў маскоўскі аўтобус.

Падараўшы тэрарыстаў, Пуцін даганяе аўтобус і сам ім кіруе. Дэманструецца дасье супергероя: аператыўны псеўданім — Чалавек Як Усе; характар — нардычны; суперсіла — усе прымаюць яго за свайго.

Тут у комікс дэсантуецца новы персанаж: страшны мядзведзь. Ён трымае ў кіпцюрастай лапе айпод з кадрамі кінапракату ў Афганістане, дзе папулярны фільм «Хуткасць». Пуцін аддае мядзведзю загад заняцца бомбай. Зняўшы скуру, зашпіленую на маланку, «наначалавек» Мядзведзеў — а гэта ён! — выконвае загад. Як падкрэслівае тэчка «Ліга супергерояў», Мядзведзеў — «гном, выхаваны мядзведзямі; здольны пераўтварацца ў мядзведзя».

Гном Мядзведзеў шэпча айподу: «Мая зваба!», выцягваючы з яго жалезныя клюшні пад войканні старой: «Каштуе цэлую пенсію!».

У прыцемках швэндаюцца ненажэрныя зомбі з вёдрамі на галовах. Пуцін падганяе Мядзведзева з воклічам «Не трэба раскачваць лодку!» адбівацца ад мерцвякоў-дэмакратаў. Тыя патрабуюць: «Далоў прывілеі на дарогах! Свабоду Ходару! Вярні нам НТВ! Дай нам абіраць губернатараў!» — цягнуць лапы да супергерояў, верашчаць.

У гэты крытычны момант на дапамогу збаўцам прыходзіць нябачны суперагент Сечын (віцэ-прэм'ер Сечын — трэці чалавек у Расіі, пуцінскі пратэжэ). Як заяўляе комікс, характар ягоны «цалкам шалёны». Ён тэхнічна нябачны, «інтуітыўна ўвесь час зліваецца з мясцовасцю».

Комікс завяршаецца з'яўленнем тоўстага троля, з якім супергерой Пуцін мусіць змагацца ў наступнай серыі.

Заходнія аглядальнікі звязваюць гэты палітычны комікс з перадвыбарчай кампаніяй Пуціна, які спрабуе перацягнуць на свой бок моладзь, што бавіць час у інтэрнэце. Але Сяргей Каленік жартуе, што комікс замовіла скандальная расійская балерына Валачкова, і кажа, што зрабіў усё бясплатна, з сябрамі. «Скласці сцэнар — тры гадзіны. Зрабіць раскадроўку — два дні. Давесці ўсё да ладу — месяц. Не дадзім суму і нудзе перашкодзіць нам адгарэзіць на выбарах 2012-га. Уся ўлада інтэрнэту!» У Каленіка маецца сцэнар ужо дзесяці серый, дзе шаман Шайгу выклікае галаву Ельцына, Навадворская пажырае сонца, а тэлежурналіст Познэр б'ецца на барыкадах у Астанкіна.

Сяргей Каленік, які ў сецевым дзённіку называе сябе «яскрава выяўленым беларусам», нарадзіўся ў 1985 годзе ў Мінску. Ён вучыўся ў Мінскім інстытуце кіравання. З 2004 года — Каленік у Маскве. Абраўшы ў павуцінні імя shlyahtich, Каленік дакарае палякаў, што тыя па волі камуністаў штучна стварылі беларускую мову і культуру, прадстаўніком якой з'яўляецца Лукашэнка.

Сяргею Каленіку прыпісваюць іранічны комікс пра спікера расійскай Думы Барыса Грызлова. Комікс пра прэм'ера-чэкіста — значна сур'ёзнейшы.

На пытанне, ці падабаецца яму Пуцін, Каленік адказаў: «Гэта ўсё роўна, што запытацца, ці падабаюцца мне мае бацькі ці брат. Брата можна не любіць, ён застанецца вашым братам, а Пуцін — гэта мой прэзідэнт».

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.
Замова № 657

Падпісана да друку 17.06.2011. 8.00.
Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.